Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!
פראלעטאריער פון אלע לענדער פאראייניקט זיך!
Proletarjusze wszystkich krajów, łączcie się!
Пролетарии всех стран, соединяйтесь!

САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ

XII год выданьня
Штодзённая газэта

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Рабочых, Сялянскіх і Чырвонаармейскіх Дэпутатаў і Савету Народных Камісараў Беларускай С. С. Р.

НЯДЗЕЛЯ
20 верасьня 1931 г.
№ 218 (3307)

Марксыцка-ленінскае выхаваньне

павінна ісьці ў ногу з ударнымі тэмпамі сацыялістычнага будаўніцтва

Пастанова ЦК КП(б)Б аб партыйнай асьвеце

У пэрыяд разгорнутага наступленьня сацыялізму па ўсім фронце і абвастрэньня клясавай барацьбы ў нашай краіне, у пэрыяд шпаркага росту нашай партыі за лік рабочых і калгасьнікаў не прайшоўшых суровай школы клясавага выхаваньня, пытаньне марксыцка-ленінскага выхаваньня набывае асабліва сур'ёзнае значэньне.

Галоўнейшай задачай марксыцка-ленінскага выхаваньня новых членаў і кандыдатаў партыі павінна быць выхаваньне ў іх бальшавіцкай партыйнасьці на падставе барацьбы за генэральную лінію партыі супроць правага і «левага» апартунізму і прымірэнцтва да яго за ўменьне праводзіць генэральную лінію партыі ў практычнай рабоце. Марксыцка-ленінскае выхаваньне павінна зьяўляцца вострай зброяй партыі ў барацьбе за ленінскую нац. палітыку, павінна зьяўляцца сродкам інтэрнацыянальнага выхаваньня, павінна дапамагаць партарганізацыі ў выкананьні рашаючых задач сацыялістычнага будаўніцтва.

Сучаснае становішча марксыцка-ленінскага выхаваньня значна адстае ад тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва і не адпавядае тым вялізарнейшым задачам, якія зараз стаяць перад партыяй (зімой было ахоплена ўсімі відамі вучобы 37 проц. гарадзкіх 69 проц вясковых арганізацый пры ахопе 40—50 проц. кандыдатаў партыі. ЦК КП(б)Б канстатуе: не ўцягненьне кандыдатаў партыі ў практычную партыйную работу, не дастатковасьць кіраўніцтва з боку райкомаў і калектываў даходзячае ў радзе выпадкаў да апартуністычнай недаацэнкі марксыцка-ленінскага выхаваньня, непрыстасаванасьць партасьветы да асаблівасьцяй вытворчасьці і с-г слабая ўвязка з практыкай сацыялістычнага будаўніцтва, незабясьпечанасьць пропкадрамі і літаратурай, зусім слабое прымяненьне сацспаборніцтва і ўдарніцтва ў сыстэме партыйнай асьветы. Выходзячы з гэтага ЦК КП(б)Б падкрэсьлівае, што задача марксыцка-ленінскага выхаваньня парт. арганізацыі зьяўляецца задачай усёй парт. арганізацыі і што кожная парт. арганізацыя нясе адказнасьць за становішча гэтага адказьнейшага вучастка работы ў такой-жа меры, як і за выкананьне рашаючых задач гаспадарчага будаўніцтва.

Бюро ЦК КП(б)Б **пастанаўляе:**

1. Адобрыць плян культпропу ЦК па арганізацыі сеткі партасьветы і ахопу парт. вучобай асеньне-зімовы пэрыяд кандыдатаў, членаў і актыву КП(б)Б, а таксама беспартыйных рабочых і калгасьнікаў. Прапанаваць гаркомам і райкомам КП(б)Б у пяцідзённы тэрмін распрацаваць падрабязны плян арганізацыі парт. асьветы па раёну, правесьці камплектаваньне, вызначыць кіраўнікоў і выкладчыкаў і забясьпечыць разгортваньне работы ў вызначаныя ЦК тэрміны.

2. Адобрыць дырэктывы і мерапрыемствы культпропу і Сакратарыяту ЦК аб падрыхтоўцы да асеньне-зімовай партасьветы (пасылка 30 культпропбрыгад на 20 дзён у раёны для дапамогі РК у арганізацыі і падрыхтоўцы сеткі, правядзеньню Ўсебеларускага дню партвучобы, радыё-пераклічка, правядзеньне нарад актыву, сходаў, ячэек па пытаньням марксыцка-ленінскага выхаваньня, правядзеньне нарад па культпрапрабоце на транспарце, скліканьне Ўсебеларускай нарады па пытаньням марксыцка-ленінскага выхаваньня і інш.). Прапанаваць ГК і РК КП(б)Б забясьпечыць поўнасьцю вытворчы прынцып у арганізацыі сеткі партасьветы, цэх, брыгада, зьмена, улічваючы асаблівасьці розных груп рабочых, старыя праізводственьнікі, моладзь і інш., маючы на ўвазе, што асноўным зьвяном для новых кандыдатаў партыі на вытворчасьці зьяўляецца двухмесячная кандыдацкая школа і школа-перасоўка ў калгасах, саўгасах і МТС з вывучэньнем статута і праграмы партыі, барацьбы на два франты за генэральную лінію партыі, новыя задачы партыі ў новых абставінах і барацьба 2-х сыстэм (СССР і капіталістычны сьвет).

3. Прапанаваць ГК і РК КП(б)Б тэрмінова выканаць дырэктывы ЦК аб падрыхтоўцы пропкадраў на мясцох, высунуць значныя кадры больш актыўных і падрыхтаваных рабочых партыйцаў для пропработы на прадпрыемствах, саўгасах, калгасах і МТС, вызваліўшы іх ад іншых нагрузак. Больш шырока скарыстаць для прапагандыцкай работы (кіраўніцтва школамі, гурткамі і выкладаньне іх) партыйны актыў, асабліва старых членаў партыі. Забараніць ГК і РК перакідку прапагандыстаў на інш. работу. Пасылку прапагандыстаў на розныя кампаніі праводзіць толькі ў выключных выпадках з дазволу ГК ці РК, з тым аднак, каб гэтая пасылка не сарвала заняткаў школы, гуртка. Прапанаваць культпропу ЦК у дэкадны тэрмін распрацаваць і дакласьці на Сакратарыяце ЦК плян падрыхтоўкі і перападрыхтоўкі пропкадраў для горада і вёскі на 1932 г. Культпропу ЦК накіраваць 10 прапагандыцкіх груп у раёны па прыкладу пропгруп ЦК УсеКП(б). Культпропу ЦК, ГК і РК забясьпечыць сталае кіраўніцтва і дапамогу прапагандыстым (Мэтаднарады, высылка мэтадраспрацовак і г. д.).

4. Адзначыць, што несвоечасовы выпуск падручнікаў дрэнна адбіваецца на рабоце па марксыцка-ленінскім выхаваньні, прапанаваць БДВ пад асабістую адказнасьць т. Некрашэвіча выдаць неабходны мінімум (першапачатковых падручнікаў і праграмы) для гарадзкой і вясковай партсеткі да 1 кастрычніка. Культпропу ЦК праверыць выкананьне гэтага і дакласьці Сакратарыяту ЦК 1 кастрычніка. Даручыць Культпропу ЦК значна паскорыць выданьне мэтодраспрацовак і заладзіць сыстэматычны выпуск «За ленінскую вучобу». Паставіць пытаньне перад культпропам ЦК УсеКП(б) аб хутчэйшым выданьні падручнікаў і праграм для школ і гурткоў.

5. Даручыць Культпропу ЦК падрыхтаваць і дакласьці на Сакратарыяце ЦК мерапрыемствы па ладвышэньні тэарытычнага ўзроўню партактыву.

6. Улічваючы, што Марксыцка-ленінскае выхаваньне новых кадраў партыі не вычэрпваецца партвучобай, а патрабуе выхаваньня бальшавіцкай актыўнасьці, — ініцыятывы, прыкладнасьці ў штодзённай рабоце—прапанаваць ГК, РК і ячэйкам уцягнуць кандыдатаў і новых членаў партыі ў практычную партыйную работу праз дачу нагрузак па розным галінам партыйнай работы, асобных прасьцейшых заданьняў, дапамагаючы і сыстэматычна правяраючы іх выкананьне, сыстэматычна правяраць так сама выкананьне кандыдатамі прасьцейшых абавязкаў кандыдатаў партыі, як своечасовая ўплата членскіх узносаў, наведваньне парт. сходаў і інш. Забясьпечыць 100 проц. удзел кандыдатаў і членаў партыі ў сацспаборніцтве і ўдарніцтве, своечасовы перавод падрыхтаваных кандыдатаў у члены партыі і высоўваньне на падставе сталага вывучэньня больш актыўных і здольных кандыдатаў на адміністрацыйна-гаспадарчую і грамадзка-палітычную работу ўнутры прадпрыёмства, саўгаса, калгаса і МТС.

7. Прапанаваць культпропу ЦК, ГК і РК КП(б)Б устанавіць праверку хода работы па разгортваньні парт. вучобы, яе зьместу, якасьці і сыстэматычнае аперацыйнае кіраўніцтва сеткай партасьветы, шляхам заслухоўваньня дакладаў ячэяк і школ на РК, Культпропнарадзе ЦК, праводзячы папярэдні агляд работы, пасылку на месца брыгад і інструктароў для праверкі і дапамогі ў рабоце, скліканьне нарад па парт. асьвеце, пасылку аперацыйных лістоў і г. д. Абавязаць РК і ГК сыстэматычна раз у дэкаду інфарміраваць ЦК аб становішчы парт. вучобы.

Даручыць Сакратарыяту ЦК сыстэматычна заслухоўваць даклады ГК і РК аб становішчы парт. асьветы. Прапанаваць ГК і РК абмеркаваць гэта пытаньне на пленумах і сходах партактыву.

8. Задача аўладаньня тэхнікай патрабуе ўвязкі марксыцка-ленінскага выхаваньня з вытворчымі пытаньнямі і шырокага ўкараненьня ў сетку парт асьветы пытаньняў тэхнікі, аднак апошняя не павінна падмяняць сабою сыстэмы і работы сеткі тэхнічнай адукацыі.

Даручыць культпропу ЦК у двухдзённы тэрмін даць канкрэтныя паказаньні мясцом аб ўкараненьні элемэнтаў тэхнікі ў сыстэму парт. асьветы. Даручыць Культпропу ЦК, аддзелу кадраў, фракцыі ЦСПСБ і ВСНГ у дэкадны тэрмін распрацаваць практычныя мерапрыемствы і ўнесьці на Сакратарыят ЦК аб пасавай тэхнічнай адукацыі на прадпрыёмствах, саўгасах і калгасах.

9. Абавязаць партактыў, выяжджаючы ў раёны па розных заданьнях, прымаць актыўны ўдзел у працы партасьветы.

Райкомы і ячэйкі КП(б)Б павінны забясьпечыць ў дні парт. вучобы ўдзел усіх знаходзячыхся на тэрыторыі ячэйкі камандыраваных, як з цэнтру, так і з раёнаў камуністаў, прысутнічаць на занятках парт. школ і гурткоў.

10. Прапанаваць ЦК ЛКСМБ і РК КП(б)Б забясьпечыць своечасовае і поўнае разгортваньне работы па Марксыцка-ленінскім выхаваньні камсамола. На Сакратарыяце ЦК заслухаць даклад ЦК ЛКСМБ аб разгортваньні гэтай работы.

11. Адзначаючы вялізарную ролю друку у справе марксыцка-ленінскага выхаваньня і зусім нязначнае асьвятленьне партрабо[ты] ў мінулым прапанаваць цэнтральным і раённым газэтам наладзіць сыстэматычнае асьвятленьне пытаньняў марксыцка-ленінскага выхаваньня, асьвятленьне станоўчага вопыту, сыгналізацыю аб прарывах і мабілізацыі партарганізацый на барацьбу з прарывамі і недахопамі ў рабоце.

Пад напорам крызісу і рэвалюцыйнай хвалі—трашчаць асновы брытанскага імпэрыялізму

Магутныя дэманстрацыі пратэсту супроць дзеяньняў „нацыянальнага“ ўраду

Рабочыя вітаюць рэвалюцыйных маракоў

ЛЕНДАН. 18-IX. Ліга вольных работнікаў выпусьціла маніфэст, у якім заклікае настаўнікаў змагацца супроць зьніжэньня заработку і іншых мер «эканоміі нацыянальнага ўраду». Маніфэст заклікае ўсіх школьных працаўнікоў арганізаваць камітэт.

У Бельпасьці адбыліся новыя дэманстрацыі супроць «нацыянальнага» ўраду. Тысячы рабочых удзельнічалі ў гэтых дэманстрацыях, закончыліся мітынгамі, на якіх рабочыя заявілі аб сваёй гатоўнасьці аказаць супраціўленьне «нацыянальнаму» ўраду. На мітынгах прыняты рэзалюцыі аб пасылцы прывітаньня маракам атлянтычнага флёту.

ЛЕНДАН, 14-IX. Паводле паведамленьня «Таймса» у раёнах Бірмы (Індыя), ахопленых сялянскім паўстаньнем, за апошнія дні значна павялічыліся актыўныя выступленьні паўстанцкіх атрадаў супроць паліцыі і войска.

Асабліва шматлікі сутычкі паміж паўстаўшымі сялянамі і войскам у акрузе Тэйетмайс, у ваколіцах буйнага маёнтку Аланмайс паўстанцы разьбілі ўрадавае войска.

„Захісталіся тры галоўных апоры ангельск й магутнасьці“

Друк Францыі і Нямеччыны аб падзеях у флёце

ПАРЫЖ. 15-IX. Лёнданскі карэспандэнт «Журналь», камантуючы паведамленьне ангельскага ўраду аб спыненьні марскіх манэўраў, піша: «ня трэба ашукоўваць сябе. Гутарка ідзе аб мецяжы ў флёце. Факт адкладаньня судна ў разгар манэўраў сьведчыць, што інцыдэнт набыў сур'ёзныя намеры».

Газэта далей паведамляе, што ўчора ў Плімуце сярод маракоў панавала вялікае незадаволеньне ў сувязі з нярэўнамерным зьніжэньнем заработку матросам і афіцэрам.

ПАРЫЖ. 19-IX. Французскі друк аддае сур'ёзную ўвагу падзеям у ангельскім флёце. Газэта падкрэсьлівае, што ўпяршыню ў гісторыі флёту, праслаўленага сваёй дысцыплінай, мела месца падобнае рэзкае непадначаленьне суднавых каманд. Параўноўваючы выступленьні ў флёце з выступленьням Гандзі на канфэрэнцыі «круглага стала», «Журналь» у перадавым артыкуле заяўляе: «ў будынку гордай імпэрыі зьявіліся трывожныя шчыліны». Надзвычайна правая «Ордр» піша. «Мецяжы ў ангельскім флёце—паказьнік слабасьці ня толькі асноўнага элемэнту ваеннай абароны краіны, але і ўсяго нацыянальнага будынку».

Камуністычная «Юманітэ» у заключэньне артыкулу, прысьвечанага руху ў ангельскім ваенным флёце, піша: «над старой Англіяй лютуе бура. Супроць «нацыянальнай» кааліцыі — ад Бальдвіна да Гендэрсона — ўзьнікае адзіны баявы фронт рабочых, беспрацоўных, служачых і маракоў, аб'ядналых вакол чырвонага сьцягу».

БЭРЛІН. 17-IX. Падзеі ў ангельскім флёце ўстрывожылі нямецкі буржуазны друк, адначасова выклікаўшы рух салідарнасьці ў нямецкай рабочай клясе. Газэты «Кельнішэ Цэйтунг» і «Франкфуртэр Цэйтунг» называюць рух бунтам.

Учора «Кэльнішэ Цэйтунг» пісала: **«ўзбуджэньне ў флёце і арміі называюць на штодзённай мове бунтам. Значыцца — бунт у ангельскім флёце.** Гэта такі нячуваны ў гісторыі факт, што яго трэба было-б трактаваць як жарт, калі-б ня было афіцыйнага паведамленьня. Няўжо ў Англіі справа зайшла так далёка, што кароль ня можа быць спакойны за свой флёт?»

Сёньня ў перадавым артыкуле «Навальніца над Англіяй» тая-ж газэта гаворыць аб тым, што тры апоры, якія здаваліся непахіснымі ў Англіі—фунт стэрлінгаў, парляманцкая сыстэма і флёт,—трашчаць па ўсіх швах.

«Франкфуртэр цэйтунг» гаворыць аб тым, што падобнага руху ў брытанскім флёце да гэтай пары нельга было нават і прадставіць. «Ангельскі флёт—гордасьць Англіі,—у сэнсе дысцыпліны быў тым-жа што і старая пруская армія. Тое, што здарылася бязумоўна зьяўляецца своеасаблівым бунтам... Дзіўна, што радыкальныя настроі ангельскага флёту выкрыліся адразу». Калі-б нават рух быў прыдушаны, лічыць газэта,—дык «ангельскаму ўраду ня так лёгка будзе паправіць маральна - палітычную шкоднасьць, якую выклікае гэты рух як унутры, так і па-за краінай». Калі ўжо да гэтага дайшло тады цяжка сабе ўявіць, што будзе ў наступны раз, пры іншых абставінах.

ЗДАНЬ „ПАЦЁМКІНА“

Мал. М. АСОТА.

Фашысцкі тэрор у Аўстрыі—наглее

ВЕНА. 14-IX. Орган кампартыі «Ротэ Фанэ» канстатуе, што сьледзтва над удзельнікамі путча зводзіцца на нішто і што яно прадстаўляе з сябе камэдыю.

Арыштаваныя кіраўнікі путча князь Штарэмбэрг, генэрал Пухмэйр і Эргніш і інш. вызвалены. Штрамбэрг вызвален пад відам, што хоць ён ведаў аб падрыхтоўцы путча, але ня быў, аднак, паведамлены аб яго тэрміне.

Адчуваючы падтрыманьне буржуазнай грамадзкасьці, фашысты наглеюць. У некаторых гарадох і мястэчках правінцыі Штырыі адбываюцца дэманстрацыі хэймвэра. Імкненьне да аб'яднаньня хэймвэрскіх арганізацый пад кіраўніцтвам буржуазных партый узмацняецца. Учора ў Вэне адбылася нарада кіраўнікоў хэймвэра, якая паводле слоў афіцыйнага органу «паказала сілу волі таварыскай сумеснай работы».

«Ротэ Фанэ» заклікаў камуністычных, сацдэмакратычных і беспартыйных рабочых абвесьціць забастоўку пратэсту супроць фашысцкага рэжыму.

У шырокіх рабочых масах Аўстрыі пануе вялікае абурэньне. У часе ўчарашніх пахаваньняў 2-х рабочых, забітых фашыстамі Капенбергу (прамыслевая мясцовасьць) адбыўся рад сутычак з паліцыяй і фашыстамі, прычым некалькі рабочых арыштавана.

Учора ў Вене адкрыўся сход кампартыі на якім сакратар кампартыі т. Кафленік зрабіў даклад аб фашысцкім рэжыму. Сход адбыўся з вялікім посьпехам пры ўдзеле сотняў сацыял-дэмакратычных рабочых. Сёньня на прадпрыемствах распаўсюдзіліся лятучкі кампартыі з заклікам да масавай забастоўкі. Паліцыя арыштоўвае рабочых, якія распаўсюджваюць гэтыя лістоўкі.

На абарону 10 тысяч рэвалюцыйных вязьняў польскага фашызму і групы польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў

Ганьба катам і іх лёкаям!

Польскі фашызм перад тварам пагрозаючых эканамічных труднасьцяй усяго капіталістычнага сьвету, у нястрыманай прагнасьці крыві накіраваў усе свае сілы для фізычнага зьнішчэньня рэвалюцыйнай рабочай клясы. Заціскаючаяся ўсё мацней на горле міжнароднага капіталу і польскага фашызму пятля крызісу ўсёй гаспадарчай сыстэмы капіталізму выклікае канвульсыйныя ўздрыгі ўсяго фашысцкага ладу, і знаходзіць сваё выражэньне ў яшчэ вастрэйшым наступе на рабочую клясу. Найвялікшым ганебным выражэньнем гэтага зьяўляецца атака на аснове драканаўскіх фашысцкіх законаў на людзкую годнасьць палітзьняволеных і ўжываньня да іх срэдневяковых катаваньняў.

У шалёнай сьпешцы ваенных падрыхтовак да нападу на СССР, у чым польскі фашызм бачыць адзіны свой ратунак, карныя экспэдыцыі на Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі, руйнаваньне ўсіх культурных інстытуцый нацыянальных меншасьцяй, суровая забарона рэвалюцыйнага слова — зьяўляюцца цэлым ланцугом прыгнечаньня працоўных мас фашысцкай Польшчы фашысцкай дыктатурай.

Найвышэйшым пунктам новай ганьбы, якая кладзецца на польскі фашызм і яго верных лёкаяў—сацыялфашыстаў з пад сьцягу здраднікаў і прадажнікаў рабочае клясы — ППС, зьяўляецца арышт вядомых левых літаратараў—Гэмпля Бранеўскага, Авата, Януша, Лева і Навагрудзкага.

Цэнтральная Польская камісія пры сакратарыяце Ўсеўкраінскай асацыяцыі пралетарскіх пісьменьнікаў кляймíць ганьбай польскі фашысцкі ўрад адначасова выражаючы сваю глыбокую пагарду так званым польскім літэрацкім колам, каторыя сваім маўчаньнем, ня толькі пакрываюць, але і падтрымоўваюць ганебны ўчынак фашызму. Ганьба і пагарда наёмным фашысцкім пісакам.

Заклікаем да масавых пратэстаў усе польскія літаратурныя і культурныя арганізацыі, настаўніцтва, клюбы і культурныя дамы, усе вышэйшыя навуковыя ўстановы, сярэднія і ніжэйшыя школы.

Аб'ядноем рэвалюцыйную і клясавую салідарнасьць, станем на абароне 10.000 палітзьняволеных польскага фашызму у абароне рэвалюцыйных змагароў пера-арыштаваных літэратараў!

Прэч з ваенна палявымі судамі. Ганьба фашысцкім катам.

Патрабуем безадкладнага звальненьня Бранеўскага, Гэмпля, Ватта, Януша, Лева, Навагрудзкага.

Няхай жыве рэвалюцыйная рабочая кляса Польшчы і яе правадыр КПП.

Бюро Польскай цэнтральнай камісіі УАПП-у: Г. Панэк, (Чарскі), М. Мысьлінскі, С. Грабоўскі.

Харкаў 15 верасьня 1931 г.

Катаржныя прысуды ў фашысцкай Польшчы

ВАРШАВА. 15-IX. Паводле паведамленьня друку Лодзінскі акруговы суд прысудзіў 19 гадовую работніцу Гэбэр да 2 год астрожнага зьняволеньня па абвінавачаньні ў распаўсюджаньні камуністычнай літаратуры.

Пасьля агалашэньня прыгавору падсудная пачала гучна пратэставаць супроць новага турэмнага статуту. За гэты пратэст суд прыгаварыў Гэбэр да дадатковага пакараньня.

ВАРШАВА. 18-IX. Кракаўскі суд вынёс прыгавор па справе абвінавачаных рабочых у сувязі з крывавымі сутычкамі паміж бастуючымі гарнякамі і паліцыяй у Янове (Дамброўскі басэйн). Як вядома, у часе гэтых сутычак паліцыяй было забіт 7 рабочых. Арыштаваныя прыгавораны да турэмнага зьняволеньня тэрмінам ад паўтара г да 4 месяцаў.

НІВОДНАЙ ГАДЗІНЫ АДСТАВАНЬНЯ!

23 верасьня рапартаваць аб поўным скончэньні сяўбы азімых

Не адрываць сяўбы ад зябу. Не забываць, што зяблевае ворыва ўзьнімае ўраджайнасьць, арганізацыйна-гаспадарча ўмацоўвае калгасы

Ня ставіць зяб у „чаргу“

Плян зяблевага ворыва выканан па БССР на 6,9 проц.

Зяблевая ўспашка па калгасах і аднаасобных бядняцка - серадняцкіх гаспадарках праходзіць ганебна маруднымі тэмпамі. Агульны плян падняцця зяблева і цаліны на 15-га верасьня выкананы толькі на 6,9 проц.

Першымі па зяблеваму ўзорваньню ідуць: Петрыкаўскі раён, які выканаў плян па ўзьняцьці зяблева на 45,8 проц., Капыльскі—37,3 проц., Сураскі—31,8, Менскі—29,10, Барысаўскі—27,5, Клімавіцкі—22,2 проц.

Рад раёнаў Беларусі ганебна цягнуцца ў хвасьце, з іх: Рэчыцкі раён выканаў плян на 0,4 проц., Уваравіцкі—0.3, Плешчаніцкі—0,2, Чашніцкі—0,3, Асіпавіцкі—0,9; Расонскі—1,6, Талочынскі—1,0 проц., Касьцюковіцкі—1,9, Крупскі—1,8, Бярэзінскі—1,7; Бягомльскі—1,4, Хойніцкі—5,0 проц. і інш.

Па ўсіх апошніх раёнах выкананьне пляну зяблевай ўспашцы не перавышае 15 проц.

Пашыраюцца рады пераможцаў

Закончылі сяўбу, змагаемся за зяб

ЦЕРАХАЎКА. (Белта). Калгас імя Варашылава, Ленінскага сельсавету, скончыў азімую сяўбу, выканаўшы плян засеву на 100 проц., Засеяна калгасам 330 га азіміны. Калгас цалкам пераключыўся на зяблевае ворыва.

Калгас «На варце», Маркавіцкага сельсавета, засеяў 133 га азіміны, што складае 95 проц. агульнага пляну. Праўленьне калгасу намеціла засеяць 20 га звыш пляну.

Прымайце выклік перадавікоў

Калгас «Пралетары», Гусарскага сельсавета, Клімавіцкага раёну, 9-га верасьня па-баявому скончыў асеньнюю сяўбу. Замест 90 га калгас засеяў 94 га азіміны.

Лёнаўборачная і лёнаапрацоўчая кампанія ў калгасе праходзіць таксама пасьпяхова. Увесь лён абмалочаны і пасланы. Калгасьнікі калгасу «Пралетары» выклікаюць калгасы: «Сацземляробства» і «Калектывіст» на поўнае і хутчэйшае скончэньне сяўбы і апрацоўку лёну.

105 га звыш пляну

Калгас імя Сталіна, Лазовіцкага сельсавета, Клімавіцкага раёна, першым ў раёне скончыў асеньнюю сяўбу. Дзякуючы правільнаму ўвядзеньню зьдзельшчыны і сацыялістычным мэтадам працы, плян выкананы з перавышэньнем на 85 га за лік распрацовак і бросавых зямель.

Паводле пляну, калгас павінен быў засеяць 220 га, а засеяна 305 га. Гэты ўзор бальшавіцкай перамогі на фронце асеньняй сяўбы павінен зьявіцца прыкладам усім калгасам БССР.

За два дні да тэрміну скончым сяўбу

Калгас перакінуў усе сілы на хутчэйшае скончэньне асеньняй сяўбы і мяркуе плян па сяўбе цалкам выканаць да 21-га верасьня.

У калгасе створаны сталыя брыгады, якія па-баявому ўзяліся за выкананьне пляну азімай сяўбы. Паміж брыгадамі пачалося сацспаборніцтва.

Хойніцкі раён.

М. Жук.

Такія тэмпы недапушчальны

Вельмі марудна праходзіць сяўба па Крупскім раёне. Ня гледзячы на тое, што тэрміны па скончэньні сяўбы ўжо мінулі, плян па раёне на сёньняшні дзень выкананы толькі на 50 проц.

Раённыя арганізацыі слаба кіравалі і кіруюць асеньняй сяўбой. Усю сваю ўвагу яны аддалі ўборачнай і іншым кампаніям, а сяўбу азімых пакінулі ў баку.

Многія калгасы раёну толькі зараз прыступілі да сяўбы. Асабліва адстае Узнацкі сельсавет, дзе плян па сяўбе азіміны выкананы ня больш як на 20 проц. Калгасы гэтага сельсавету «Новы шлях», «Чырвоная зорка», «Зьвязда», «1-га мая» толькі зараз пачалі сяўбу. Палова калгасаў сеюць незачышчаным насеньнем. За зяблевае ворыва калгасы яшчэ ня браліся.

Раённым арганізацыям трэба па-бальшавіцку ўзяцца за ліквідацыю прарываў у асеньняй сяўбе.

Аляксёнак.

Лепшым—прэміі

Магілеў. (Белта). Райпрафсавет, Райза і рэдакцыя газэты «Камунар Магілеўшчыны» абвясьцілі конкурс паміж калгасамі, сельсаветамі і вёскамі, на лепшае правядзеньне сяўбы, зяблевай успашкі, уборкі, абмалоту і расьцілу лёну, а таксама і загатоўчай кампаніі.

Для прэміяваньня лепшых калгасаў і сельсаветаў адпушчаны фонд у суме 11.000 рублёў.

Калгас «Чырвоны бор», Вялікаборскага сельсавету, у гэтым годзе павінен засеяць азімінай 75 га, але на 15 верасьня плян па сяўбе выкананы толькі на 50 проц.

Выкарчоўваць праваапартуністычную практыку

Вушацкі раён павінен штодзённа засяваць 4.000 га

Асеньняя сяўба па Вушацкім раёне праходзіць ганебна маруднымі тэмпамі. Вушацкі раён зьяўляецца раёнам паўночнай паласы. Згодна пастановы ЦК КП(б)Б, усе паўночныя раёны павінны былі скончыць асеньнюю сяўбу не пазьней 1-га верасьня, але па Вушацкім раёне на 12-ае верасьня калгасы засеялі 5.483 га замест 10.372 га, аднаасобны сэктар засеяў 5.703 га замест 9.025.

Паданыя лічбы сьведчаць аб тым, што ў Вушацкім раёне на фронце асеньняй сяўбы маецца ганебнейшы прарыў. РК КП(б)Б і РВК своечасова прымалі меры для таго, каб да 5-га верасьня асеньняя сяўба па раёне была цалкам скончана. Увесь раённы партыйны і камсамольскі актыў быў некалькі разоў мабілізаваны на правядзеньне сяўбы, але на мясцох сельсаветы, партыйныя і камсамольскія ячэйкі да гэтага мерапрыемства аднесьліся пасыўна, абяцаючы: «пасьпеем, яшчэ зіма далёка. Нельга так рана сеяць збожжа». Гэтыя праваапартуністычныя разважаньні не атрымлівалі належнага адпору.

Адной з асноўных прычын такога ганебнага становішча зьяўляецца несвоечасовая падрыхтоўка да асеньняй сяўбы. Падрыхтоўка пачата была позна. У многіх калгасах вялікая частка інвэнтара не была адрамантавана. За малацьбу, ачыстку і пратручваньне збожжа ўзяліся вельмі позна, што таксама адбілася на пасьпяховым ходзе сяўбы.

Усё гэта, разам узятае, прывяло да таго, што на 12-га верасьня плян азімай сяўбы выкананы па Вушацкім раёне толькі на 53 проц.

Неабходна прыняць тэрміновыя меры, каб да 23 верасьня скончыць асеньнюю сяўбу.

Кароль Кастусь.

9.000 рабочых—Данбасу

ЛЕПШЫХ КАЛГАСЬНІКАЎ—УСЕСАЮЗНАЙ КАЧАГАРЦЫ

За зрыў вярбоўкі ў Данбас распушчаны праўленьні калгасаў імя Сталіна (Рэчыца), імя Варашылава (Лоеў), імя ОЗЭТ і імя Сталіна (Рагачэўскі раён)

Да адказнасьці зрываючых вярбоўку рабочай сілы

Аб ходзе вярбоўкі рабочай сілы для Данбасу

Пастанова Праўленьня Калгасцэнтру БССР

Канстатаваць, што па большасьці раёнаў вярбоўка рабочай сілы для Данбасу сярод калгасьнікаў усё яшчэ праходзіць нездавальняюча, у выніку неразуменьня з боку раду калгасасаюзаў сваіх задач у практычным садзейнічаньні гаспадарчым органам у арганізаваным наборы рабочай сілы. Асобныя калгассаюзы (Лоеўскі і інш.) не вядуць належнае барацьбы з тымі праўленьнямі калгасаў, якія злачынна зрываюць ход вярбоўкі, не даючы даведак калгасьнікам, жадаючым ісьці ў адыход.

Выходзячы з чаго.

1. Абавязаць калгассаюзы арганізаваць на справе сапраўднае садзейнічаньне гаспадарчым органам у вярбоўцы рабочай сілы на аснове заключэньня дагавароў.

Устанавіць, як правіла, што калгассаюзы да скончэньня работы па вярбоўцы рабочай сілы павінны кожныя 2 дні правяраць ход вярбоўкі па калгасах, прымаючы практычныя меры, гарантуючы своечасовае выкананьне заданьняў вярбоўкі па раёну.

2. Абавязаць калгассаюзы практычна ажыцьцявіць дырэктывы Калгасцэнтру аб пераважным і лепшым забясьпечаньні сельскагаспадарчымі машынамі тых калгасаў, якія лепш арганізоўваюць адыходніцтва.

3. Прапанаваць Рэчыцкаму, Лоеўскаму і Рагачоўскаму калгассаюзам распусьціць праўленьні наступных калгасаў і прыцягнуць старшынь гэтых калгасаў да суровай адказнасьці за зрыў вярбоўкі: праўленьне калгасу імя Сталіна, Рэчыцкага раёну, імя Варашылава—Лоеўскага р-ну, імя ОЗЭТ і імя Сталіна Рагачоўскага раёну.

4. Лічыць ненармальным, што НКПрацы да апошняга часу не прадставіў своечасова зводак аб ходзе вярбоўкі па раёнах, з паказаньнем колькасьці завярбаваных калгасьнікаў. Прасіць НКПрацы забясьпечыць своечасовую інфармацыю Калгасцэнтру аб ходзе вярбоўкі па раёнах.

Старшыня Праўленьня Калгасцэнтру БССР **Міцькоў.**

Апартуністы зрываюць вярбоўку

Кантрольная лічба для Клімавіцкага раёну на вярбоўку шахцёраў вызначана 400. Гэта лічба была своечасова разьмеркавана па асобных сельсаветах, у кожным сельсавеце быў вызначаны адказны работнік за выкананьне дадзенай разьвёрсткі, як па лініі РК, так і па лініі РВК, даны падрабязныя яскравыя паказаньні наконт практычных мерапрыемстваў па выкананьні гэтых лічбаў, вызначаны тэрміны і разасланы па сельсаветах упаўнаважаныя.

Як быццам зроблена ўсё, але-ж замест таго каб да 15 верасьня накіраваць у Данбас 70 проц. разьвёрсткі, альбо 280 чалавек раён фактычна даў толькі... 18 шахцёраў.

Дзе прычыны зрыву? Тут можа быць толькі адзін адказ. Апартуністычная недаацэнка гэтай важнейшай работы як раённымі арганізацыямі так і работнікамі на месцах.

Растлумачальная работа па азнаямленьні шырокіх мас калгасьнікаў і аднаасобнікаў з пастановаю ЦВК і СНК аб падрыхтоўцы. а таксама з тыпавою ўмоваю «угля» якая дае калгасам рад ільгот праведзена ня была, ня была створана грамадзкая думка вакол гэтай важнейшай палітычнай кампаніі.

Райпрофсавет зусім нічога не зрабіў па вярбоўцы рабочых на Данбас. Райкалгассаюз апрача абежнікаў разасланых калгасам ніякіх захадаў не прыняў. Камсамольская арганізацыя вельмі мала цікавіцца гэтым пытаньнем і разьвёрсткі таксама ня выканала. Да 10 верасьня ні аднаго камсамольца не накіравалі ў Данбас.

У той час суседні Касьцюковіцкі раён высунуў сустрэчны плян па вярбоўцы шахцёраў на Данбас і перавыканаў сваю кантрольную лічбу. Клімаўшчына-ж плянецца ў хвасьце.

Бальзоўскі.

Праверыць выкананьне паказаньняў тав. Сталіна

ІНІЦЫЯТЫВУ КАМСАМОЛЬЦАЎ ВІЦЕБСКАЙ АБУТКОВАЙ--

аб сацыялістычным канвэеры якасьці перакінуць на ўсе прадпрыемствы БССР. Вопыт абутковай—вучыць як па-новаму ў новых умовах трэба выконваць паказаньні тав. Сталіна

За сацыялістычны канвэер якасьці!

Выконваючы рашэньні другога Ўсебеларускага зьезду рабселькораў, рабочыя скурабутковых прадпрыемстваў уключыліся ў сацыялістычны канвэер якасьці. Сацыялістычны канвэер стаў асновай барацьбы за палепшэньне якасьці прадукцыі, захаваньне рэальнай заработнай платы рабочых.

Ініцыятыва сацыялістычнага канвэеру належыць камсамольцам Віцебскай абутковай фабрыкі імя Лекерта, якія першымі ўключыліся ў канвэер якасьці. Рабочыя Менскай абутковай ф-кі, прапрацавалі значэньне канвэера на рэдкалегіі, на сходзе інжынэрна-тэхнічных працаўнікоў, ва ўсіх цэхах і брыгадах. Было вызначана рад канкрэтных мерапрыемстваў па палепшаньні якасьці і па скарыстаньні адыходаў.

Уключыўшыся ў сацыялістычны канвэер якасьці, рэдкалегія пачала практыкаваць выданьне штодзенных насьценгазэт «За работу па - новаму». Гэтыя насьценгазэты мабілізуюць масы на барацьбу з усімі непаладкамі на вытворчасьці. Не застанаўляючыся на выпуску штодзенных насьценгазэт рэдкалегія «Чырвонага Абутніку» арганізавала абменныя паласы з газэтай скурнага заводу «Бальшавік»—«Рабочае Вока».

На заводзе «Бальшавік» для лепшага правядзеньня сацыялістычнага канвэеру ў кожным цэху вылучаны спэцыяльныя чацьвёркі і агульназаводзкая тройка, якая сачыць за тым, каб на шляху сацыялістычнага канвэеру ня было ніякіх затрымак.

Па другім шляху пайшлі скурна-абутковыя прадпрыемствы Віцебску. Папярэдне прапрацаваўшы пытаньне сацыялістычнага канвэеру на сваіх прадпрыемствах паасобку, была склікана аб'яднаная вытворчая нарада Віцебскага скурзаводу і абутковай фабрыкі імя Лекерта. На гэтай нарадзе абутковай фабрыкай скурзаводу быў прад'яўлены сацыялістычны рахунак, які прыняты поўнасьцю і будзе выкананы.

Магілеўскі скурзавор імя Сталіна апроч таго, што ўзяў на сябе рад абавязацельстваў, ўзяў на буксір Магілеўскую рымарнасядзельную фабрыку, якая адстае ў выкананьні прамфінпляну. Рабочыя скурзаводу імя Сталіна раставілі на рымарнай фабрыцы рабкораўскія кантрольныя пасты, якія дапамагаюць ліквідаваць прарыў.

Атрымаўшы адпаведную дапамогу, рымарская фабрыка таксама ўключылася ў сацыялістычны канвэер якасьці і выклікала на сацыялістычнае спаборніцтва па палепшаньні якасьці Менскую лямцавую фабрыку.

Такім чынам, мы маем магчымасьць сёньня сказаць, што сацыялістычны канвэер, які ахапіў усе скурна-абутковыя прадпрыемствы становіцца неабходнай часткай работы ў барацьбе за пасьпяховае выкананьне і перавыкананьне прамфінпляну. Упор у сацыялістычным канвэеры ўзяты на ўстанаўленьне кантроля ва ўсіх зьвеньнях вытворчасьці.

Адзінай прадпасылкай нармальнага і бесьперабойнага руху сацыялістычнага канвэера зьяўляюцца штодзенныя дзесяцімінутныя нарады, новыя рацыяналізатарскія прапановы, штодзённая мабілізацыя мас на барацьбу за якасьць, шырока разгорнутае асьвятленьне і крытыка ўсіх маючыхся недахопаў скурабутковых прадпрыемстваў. Вопыт абутковых фабрык і гарбарань павінны скарыстаць і іншыя прадпрыемствы БССР. **Курачкін.**

Зьменна-сустрэчны—на дапамогу падвышэньню якасьці прадукцыі

Нарада нізавых брыгадных трыкутнікаў (групарторгаў, праворгаў, майстраў, разам з групавымі арганізатарамі вытворчых нарад-брыгад) чырвона стандарнай гарбарні «Бальшавік» дала рашучы штуршок пераводу канвэеру якасьці з нерабочага на поўны ход.

Адным з галоўных рухавікоў канвэеру павінен быць зьменна-сустрэчны.

10-мінутныя вытворчыя нарады павінны практыкавацца перад пачаткам работы кожнай брыгады, кожнай зьмены. Яны забясьпечаць больш шпаркую мабілізацыю членаў брыгады на зжыцьцё ўсіх непаладак і ў брыгадах і ў цэхох, забясьпечаць узьняцьцё прадукцыйнасьці працы і выкананьне ўзятых на сябе абавязкаў па канвэеру якасьці. Вось пад гэтым кутом гледжаньня прайшла нарада.

Адным з асноўных тормазаў нармальнай работы зьяўляецца непадрыхтаванасьць складу сыравіны да плянавай падачы сыравіны ў схромавыя цэхі. Склад ня можа сказаць, што ён дасьць у замочку на заўтра. Гэта робіць больш цяжкай работу цэхаў, бо майстры ня могуць падрыхтаваць пасуду і матар'ялы, брыгада адмочнікаў ня зможа браць сустрэчных, ня ведаючы якую сыравіну ёй прыдзецца апрацоўваць. У выніку—ў замочку даюць усё што папала і ў адзін і той-жа дзень замачваюць некалькі відаў сыравіны рознай вялічыні і шчыльнасьці, што адбіваецца на прадукцыі.

На складзе пануе поўная абязьлічка, рабочыя па некалькі разоў у дзень перакідаюцца з аднэй работы на другую і не адказваюць ні за адну з іх.

Адміністрацыя глядзіць на гэта скрозь пальцы, адгаварваючыся абяцаньнямі, што з пачатку загатоўчага сэзону будуць прыняты нейкія меры.

Неабходна пакончыць з гэтымі апартуністычнымі разважаньнямі. Адміністрацыя складу сыравіны павінна зараз-жа перабудаваць сваю работу, прыстасаваўшы яе выключна да патрэб заводу. Даючы ў замочку вытворчыя партыі сыравіны, склад сыравіны павінен на 3 дні наперад паведамляць аб тым цэхі, а таксама паведамляць і аб тым якую сыравіну ім прыдзецца апрацоўваць.

Правядзенью гэтых мерапрыемстваў павінна дапамагчы ўся грамадзкасьць складу сыравіны.

Мэханічны цэх, які адыгрывае адну з важнейшых роляй на заводзе, ад якасьці работы машын і варштатаў якога залежыць якасьць выпускаемай прадукцыі павінен таксама ўзьняць актыўнасьць рабочых, якая да гэтага часу яшчэ слаба адчуваецца.

Сваячасовая падача пары і вады будзе садзейнічаць выкананьню зьменна сустрэчных абавязкаў брыгад.

10-мінутныя вытворчыя нарады павінны праходзіць абавязкова з удзелам сьлесарэй, якія прымацаваны да пэўных машын для іх рамонту з тым, каб рабочыя, якія працуюць на гэтых машынах маглі ім зазначыць на ўсе недахопы рамонту.

Адміністрацыйна-інжынэрна - тэхнічны пэрсаналь заводу і цэхаў, майстры і бракёры павінны ўзяць на сябе абавязак забясьпечыць вывешваньне на відным месцы, да пачатку работ кожнай брыгады, іх дзённае вытворчае заданьне з зазначэньнем колькасьці і відаў сыравіны.

Пасьля кожнага дню работы павінны праводзіцца 10-мінутныя тэхнічныя нарады, на якіх будуць падагульвацца вынікі адпрацаванага дню і абгаварвацца падрыхтоўка да наступнага дню.

Ня гледзячы на вельмі адказныя задачы інжынэрна - тэхнічныя работнікі заводу «з прахладцам» аднесьліся да нарады нізавых трыкутнікаў. З 118 прысутных на нарадзе, членаў ІТР было толькі — 9. Ніводнага прадстаўніка ня было са складу сыравіны і заліцейнага цэху. Галоўны мэханік заводу тав. Буры не палічыў патрэбным нават пабыць да нарады.

Нарада пастанавіла прапанаваць бюро ІТР заводу прыняць неабходныя меры да тых майстраў, якія не зьявіліся на нараду.

Рабкоры заводу павінны ўзяць на сябе абавязкі шырокага абмену вопытам работы зьменна-сустрэчных, папулярызуючы перадавыя брыгады і дапамагаючы адстаючым. Да гэтай мэты ў кожнай брыгадзе павінен быць створан рабкораўскі пост. Кожны з хромавых цэхаў павінен выпускаць па 3 штодзённых насьценных газэты. (адмочна-зольнае аддзяленьне, дубільна фарбова-стругальнае аддзяленьне, і аддзелачнае аддзяленьне). Па аднэй насьценгазэце павінны выпускаць астатнія цэхі, адну насьценгазэту—бюро рацыяналізацыі і БРВ, адну агульназаводзкую (апошнія дзьве ўжо выпускаюцца). Найбольш буйныя брыгады, па вопыту рамшчыкаў 1-га хромавага цэху, павінны таксама выпускаць свае брыгадныя насьценгазэты.

Толькі мэтадам сацыялістычнага абмену вопытам, мэтадам сацспаборніцтва і ўдарніцтва мы забясьпечым ажыцьцяўленьне зьменна - сустрэчных ператворым канвэер якасьці ў магутны рычаг выкананьня і перавыкананьня прамфінпляну па ўсіх яго паказьніках.

Язэп Шамэс.

Палепшыць якасьць скурсыравіны

Калі па колькасных паказьніках на Віцебскім скурзаводзе і ёсьць дасягненьні, дык у той час па якасных—справа абстаіць далёка нездавальняюча.

У большасьці выпадкаў скурсыравіна псуецца пры праходжаньні ад здатчыка па загатоўчых пунктах, складах і базах да вытворчасьці. На гэтым шляху мы назіраем самыя нядбайныя адносіны да скурсыравіны, асабліва на прыймовых пунктах райспажыўсаюзу, райкаапсаюзу і райкалгассаюзу. Загатоўленая скурсыравіна ляжыць кучамі на падлозе, разам з іншымі відамі загатовак (ўтыльсыравіна, жалеза, галёшы, усякае ламачча і інш.).

Кансэрваваньне скурсыравіны праводзіцца несваячасова і няўмела, што тлумачыцца няспрактыкаванасьцю і не падрыхтаванасьцю загатоўцаў Самае неабходнае мокрасалёнае кансэрваваньне праводзіцца без зьняцьця навалу, бруднай сольлю, што скуру робіць бруднай і дзякуючы гэтаму нельга выявіць яе прыродныя недахопы. Гэта зьніжае якасьці скуры У большасьці загатоўцы, якія праводзяць загатоўку ўсіх відаў сыравіны, зьяўляюцца «ўнівэрсаламі», а канкрэтнага ня ведаюць нічога. Падрыхтоўкай спэцыялістых па загатоўках, паглыбленьнем іх ведаў, шляхам навучаньня ва каротка-тэрміновых курсах, загатоўчыя арганізацыі, пачынаючы з Саюзскур, не займаюцца. Растлумачальнай працы сярод насельніцтва не вядзецца.

Да кожнай загатоўчай арганізацыі прымацавана па некалькі сельсаветаў раёну. Але гэтае прымацаваньне застаецца толькі на паперы. Райспажыўсаюз і райкаапсаюз у гэтым напрамку нічога ня робіць. Інструктажу сельспажыўкаапэрацыі і сельсаветаў у галіне загатовак не праводзіцца. Паміж загатоўчымі арганізацыямі ня існуе сувязі ў рабоце. Райспажыўсаюз і райкаапсаюз недавыконваюць плянаў загатовак.

Саюзскур да гэтага часу зусім не займаўся пытаньнем выяўленьня канкрэтных вінаватцаў у псаваньні сыравіны ў час знаходжаньня яе на пунктах і складах загатоўчых арганізацый. Наглядаюцца нядбайныя адносіны да зьняцьця скур на рэзьніцы Віцебскага мясакамбінату. Скуры псуюцца, маецца шмат падрэзаў Ня гледзячы на паказаньні з боку Саюзскуры аб найбольш рацыянальным зьняцьці скур, Белмяса працягвае сваю нядбайную работу, тлумачачы гэта адсутнасьцю дырэктыў з боку Наркамснабу.

У месячным паходу за якасьць скурсыравіны трэба ўнесьці рашучы пералом у галіне зьняцьця сьвінных скур, якія зьяўляюцца зараз вельмі важнай і добрай крыніцай сыравіннай базы. Пастанова ўраду аб абавязковым здыманьні сьвінных скур і катэгарычнай забароне асмальваньня і ашпарваньня забітых сьвіней, ня выконваецца. Гарсавет і міліцыя да гэтага часу ня прымаюць належных мер да спыненьня гэтых агідных адносін да вельмі каштоўнай і неабходнай сыравіны.

Гарпрафсавет у гэтым напрамку таксама нічога не зрабіў. Ёсьць рабочыя, якія маюць сваіх уласных сьвіней, яны іх забіваюць і замест здыманьня скур забітых сьвіней асмальваюць.

Такое становішча ў далейшым нецярпіма. Месячнік паходу за якасьць сыравіны павінен у гэтай справе даць вялікі зрух.

Саюзскур і ўсе загатоўчыя арганізацыі павінны неадкладна выканаць, як па колькасьці, так, асабліва, па якасьці плян загатовак.

Белмяса, Саюзскур і іншыя загатоўчыя арганізацыі павінны неадкладна ўключыцца ва Ўсебеларускі сацыялістычны канвэер якасьці скурна-абутковай прамысловасьці, які павінен ахапіць усе працэсы вытворчасьці, пачынаючы ад забою жывёлы і зьняцьця скуры да продажу гатовага абутку.

Валдай.

Культабслугоўваньне пасеўнай--на належную вышыню

Сацыялістычныя мэтады работы, якія ўжываліся ў час веснавой сяўбы паставілі асьветнікаў БССР на першае месца пры выкананьні дагавору з Уральскімі асьветнікамі на лепшае правядзеньне і ўдзел асьветнікаў у 2-ой бальшавіцкай вясьне. Гэта было адзнана арбітрам асьветнікаў БССР і Уралу — газэтай «За Коммунистическое Просвещение».

У сувязі з гэтым, перад асьветніцкай арміяй паўстае задача яшчэ больш арганізавацца і мабілізаваць усе свае сілы на выкананьне плянаў і задач асеньняй пасеўкампаніі рашаючага году пяцігодкі.

Баявая праграма і задачы гэтай адказнай гаспадарча-палітычнай кампаніі з усёй яскравасьцю вызначаны ліпеньскім пленумам і ў далейшых пастановах ЦК КП(б)Б.

«Забясьпечыць летам і ўвосень 1931 г. 710.000 га папару пад азімыя, засеяць 1.350.000 га азімых, узьняць 1.500.000 га пад зябліва» (з рэзалюцыі ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б).

Змаганьне за выкананьне гэтай бальшавіцкай праграмы дзейнасьці павінна зьвязацца говарам кожнага асьветніка.

Асноўны ўпор удзелу асьветнікаў у гэтай кампаніі павінен быць зроблен на тое, каб у гэтую работу была ўцягнута культустанова цалкам па канкрэтным распрацаваным пляне дзейнасьці, выходзячы з вытворчага пляну данае культустановы. Уключыць у праграму і вучэбны матар'ял школы, тэхнікуму, ВНУ, плян пасеўнай кампаніі сельсавету, на тэрыторыі якога знаходзіцца культустанова, плян калгасу, саўгасу, МТС, з якім школа зьвязана, скарыстаўшы пры правядзеньні пасеўнай кампаніі ўсе матчымасьці для палітэхнізацыі школы. Асьветнікі павінны накіраваць свой удзел у гэтай кампаніі на лепшую арганізацыю культабслугоўваньня: выпуск насьценных газэт, у якіх асьвятляць канкрэтныя задачы сельсавету, калгасу ,саўгасу, вёскі ў правядзеньні пасеўкампаніі, пляны і выкананьне, паказаць перадавікоў сяўбы, выяўляць кулацкую агентуру і арганізаваць масу на барацьбу з ёю, дзяліцца вопытам працы і г. д.

Асаблівая ўвага павінна быць зьвернута ў першую чаргу на арганізаваньне працы ў калгасах, на аказаньне практычнай дапамогі ў пераводзе ўсяе працы на зьдзельшчыну, вучот працы, ліквідацыю абязьлічкі, разгортваньне сацыялістычнага спаборніцтва і ўдарніцтва.

Выкананьне плянаў асеньняй сяўбы павінна даць новы магутны прыліў калгасьнікаў, мы павінны змагацца за выкананьне пастановы ліпеньскага пленуму ЦК КП(б)Б. «Мабілізаваць усю ўвагу з такім разьлікам, каб да вясеньняй сяўбы 1932 году было калектывізавана ня менш 75 проц. бядняцка-серадняцкіх гаспадарак БССР» (з пастановы пленуму ЦК КП(б)Б).

Барацьба за выкананьне плянаў асеньняй пасеўкампаніі і далейшы рост калектывізацыі, бясспрэчна выклікае супраціўленьне клясавага ворага. Кулак і яго агентура будуць змагацца супроць плянаў пасеўкампаніі, калектывізацыі, супроць зьдзельшчыны, супроць уліку працы, супроць зьнішчэньня абязьлічкі, супроць кантрактацыі і г. д. Гэтая клясавая барацьба будзе мець сваіх прыхільнікаў і сярод асобных «асьветнікаў», якія пад шыльдай асьветнікаў выконваюць заданьні кулака. Асьветніцкая чырвоная армія павінна даць самы рашучы адпор усім тым, хто хоча цягнуць нас назад, хто перашкаджае нам будаваць сацыялізм.

Н. Левін.

Пад знакам самай шчыльнай і непарыўнай сувязі працоўных з Чырвонай арміяй--праходзяць манэўры РСЧА

Чырвоныя абозы з хлебам у адзнаку манэўраў РСЧА

РАЁН МАНЕЎРАЎ. 19-IX (Белта) Калгасьнікі з вялікай зацікаўленасьцю аднесяцца да манэўраў, выражаючы сваю любоў да Чырвонай арміі. Практычнай справай калгасы і сельсаветы №-скага раёну выкарыстоўваюць манэўры для сваячасовага, а ў некаторых калгасах датэрміновага выкананьня гаспадарчых кампаній. Раён адстаў з уборкай тэхнічных культур. У зьвязку з манэўрамі калгасьнікі па ўдарнаму ўзяліся за ўборку. Зараз уборка скончана. Такія-ж ударныя тэмпы ўжываюцца пры пасеве.

Калгасы і бедняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў спатыкаюць манэўры датэрміновым выкананьнем загатовак. Учора раённы цэнтр з раніцы быў запоўнены падводамі. Над падводамі былі чырвоныя сьцягі—гэта калгасьнікі і аднаасобнікі 4-х сельсаветаў арганізаванымі чырвонымі абозамі адзначаюць манэўры Чырвонай арміі. За дзень здадзена збожжа, бульбы, капусты каля 200 фурманак. Раённыя арганізацыі ледзь спраўляюцца з прыёмкай. Колькасьць фурманак усё павялічваецца. З дальніх сельсаветаў паведамляюць ,што там рыхтуюцца чырвоныя абозы, якія ў раённы цэнтр прыбудуць заўтра. Такім чынам струмень чырвоных абозаў ператворыцца ў адзіны магутны абоз. З такім вялікім энтузіязмам калгасьнікі і бедняцка-серадняцкія масы аднаасобнікаў адзначаюць манэўры сваёй Чырвонай арміі.

Чырвоны крыж уключыўся ў манэўры

РАЁН МАНЭЎРАЎ. 19-IX. (Белта). У манэўры ўключыліся арганізаваныя мясцовымі ячэйкамі Чырвонага крыжу пункты першай дапамогі. Пункты функцыянуюць другія суткі. Імі праводзіцца вярбоўка ў сябры таварыства Чырвонага крыжу.

Манэўры РСЧА выліваюцца ў дэманстрацыю цеснай сувязі з працоўнымі БССР

РАЁН МАНЭЎРАЎ, 18-IX. (Спэцкор.). Саўгасы, калгасы і масы беднякоў і серадняцкоў аднаасобнікаў рыхтуюцца да сустрэчы манэўруючых часьцей. Саўгасы і калгасы. падаюць сапраўдны прыклад брацкіх адносін да нашай Чырвонай арміі.

Саўгас Р. у спэцыяльным рапарце Чырвонай арміі апавядае аб сваіх дасягненьнях і недахопах. Рабочыя і служачыя даюць на матарызацыю пагранвойска 216 руб., на пабудову эскадрыльлі імя 8 загінуўшых—147 р., у МОПР—45 руб. Апрача таго, у адзнаку спатканьня з часьцямі Чырвонай арміі і для падтрыманьня сталае сувязі і ўмацненьня абароназдольнасьці краіны, саўгас Р. вылучыў жарабца трох гадоў для гадоўлі, як «каня абароны».

Калгасьнікі калгасу Ф. разам з аднаасобнікамі да прыходу Чырвоных часьцей абавязваюцца: арганізаваць чырвоны абоз з хлебам, засеяць азімага ў фонд абароны краіны звыш пляну, да 1-Х выканаць усе загатоўкі і засеяць поўнасьцю азімы клін.

Калгасьнікі, бедлякі і серадлякі в. Ш. запэўняюць Чырвоную армію, што ўсе гаспадарча - палітычныя кампаніі будуць імі праведзены ў тэрмін і заданьні выкананы. 19 верасьня выяжджаюць чырвоным абозам з хлебам. Абавязваюцца арганізаваць шырокі прыліў у калгасы. Узмоцненымі тэмпамі скончыць сяўбу на 100 проц. Калгасьнікі вылучылі камісію для праверкі 100-процантнага засеву азімага кліну аднаасобнікамі і выяўленьня зрыўшчыкаў сяўбы. Абавязваюцца скончыць зяблева да 10-Х. Засяваюць сіламі калгасу і ячэйкі АСО-Авіяхіму 1 га ў фонд абароны краіны.

Селькоры вёскі М. выпускаюць спэцыяльны нумар насьценгазэты прысьвечаны сустрэчы Чырвонай арміі. У газэце тлумачаць сутнасьць і задачы манэўраў і апавядаюць аб дасягненьнях і недахопах свае вёскі. Селькоры ўзялі на сябе абавязак упрыгожыць вёску лёзунгамі, плякатамі і падрыхтаваць рапарт Чырвонай арміі. Гэты рапарт, напісаны на фанэры, яны вывешваюць каля хаты-чытальні, каб чырвонаармейцы часьцей, рапарт свае вёскі часьцям Чырвонае якія будуць спыняцца ў вёсцы, маглі прачытаць яго.

Саўгасы, калгасы, і вёскі ўпрыгожваюцца аркамі, лёзунгамі, плякатамі. Вывешваюцца рапарты Чырвонай арміі. Сьпешна папраўляюцца дарогі. Уся работа набывае сапраўды баявыя тэмпы. Расьце прыліў у калгасы.

Аднаасобнікі вёскі Д. на сваім сходзе 17-IX пастанавілі арганізаваць калгас. У калгас ўжо ўступіла з 40 гаспадарак—11.

Партыйныя і савецкія органы раёну В. выпусьцілі адозву да ўсіх рабочых, калгасьнікаў, беднякоў і серадняков раёну з заклікам лепшымі прыкладамі ў рабоце, выкананьнем пастаўленых партыяй задач, узмоцненымі тэмпамі давесьці сваю поўную гатоўнасьць змагацца за пабудову сацыялізму, за абароназдольнасьць савецкай краіны.

Баявым настроем, энтузіязмам будаўніцтва захапляюцца шырокія масы рабочых саўгасаў, калгасьнікаў, беднякоў і серадняков аднаасобнікаў. Манэўры часьцей Чырвонай арміі выліваюцца ў шырокае сьвята працы і бальшавіцкіх тэмпаў.

Р. Мурашка.

Аб дапамозе калгасьнікам прызваным у Чырвоную армію

з пратаколу праўленьня Калгасцэнтру Саюзу ССР

У мэтах аказаньня найбольш дзейнай дапамогі сем'ям калгасьнікаў-чырвонаармейцаў, праўленьне Калгасцэнтру СССР прапануе праўленьням калгасаў праводзіць наступныя мерапрыемствы:

На ўвесь час прызыву калгасьнікаў у армію для прахаджэньня бесьперапыннай службы ў кадрах РСЧА на ўнявайсковае навучаньне і ў пераменны склад тэрытарыяльных часьцей, а таксама на ўсякага роду іншыя вайсковыя зборы—калгасы абавязаны аказваць сем'ям прызваных неабходную дапамогу (апрацоўка і ўборка сіламі калгасу прысядзібных зямель, возка дроў, рамонт жылых будынкаў, прадастаўленьне коняй для асабістых патрэб і г. д.).

Дзеці калгасьнікаў прызваных для прахаджэньня бесьперапыннай службы ў кадрах РСЧА і на зборах пераменнага складу, пры наяўнасьці ў калгасе ясьляў, дзіцячых пляцовак і дзіцячых садоў, прымаюцца ў іх у першую чаргу.

Члены сем'яў прызваных праўленьнямі калгасаў накіроўваюцца на розныя курсы па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы ў першую чаргу.

Працаздольным членам сем'яў, прызваных для прахаджэньня бесьперапыннай службы ў кадрах РСЧА і на зборах пераменнага складу, праўленьня калгасаў прадастаўляюць нарады на работы ў першую чаргу.

Дапамога з боку калгасаў сем'ям калгасьнікаў, прызваных для прахаджэньня безперапыннай службы ў кадрах РСЧА і на зборах пераменнага складу, аказваецца калгасамі, незалежна ад дапамогі, якая аказваецца гэтым сем'ям органамі сацзабясьпекі.

Калгасьнікам, якія прызываюцца для прахаджэньня безперапыннай службы ў кадрах РСЧА, праўленьні калгасаў абавязаны выдаваць аднгачасовую дапамогу ў разьмеры вызначаемым агульным сходам, але ня ніжэй 25 руб. Паказаная сума выдаецца прызванаму толькі ў момант адпраўкі яго ў вайсковую часьць.

Пры прызыве калгасьнікаў у пераменны склад тэрчасьцей, а таксама на ўсякага роду іншыя вайсковыя зборы працягласьцю больш аднаго месяца, праўленьні калгасаў абавязаны выдаць прызваным аднгачасовую дапамогу ў разьмеры, які вызначаецца агульным сходам, але ня ніжэй 10 руб.

Сям'і калгасьніка, прызванага на вайсковае навучаньне ў тэрчасьці і добрасумленна працаваўшага ў калгасе, калгас аказвае дапамогу, шляхам налічэньня працадзён у разьмеры ад палавіны да трох чвэрцяй выпрацоўкі, добрасумленна працаваўшага калгасьніка аднолькавай з прызваным кваліфікацыі.

Праўленьні калгасаў абавязаны безваротна прадастаўляць калгасьнікам прызываемым у армію, або на вайсковыя зборы, сродкі перасоўваньня да прызыўных пунктаў, альбо пунктаў збору.

Улічваючы вялікае палітычнае значэньне забесьпячэньня сем'яў чырвонаармейцаў-калгасьнікаў, праўленьне Калгасцэнтру прапануе райкалгассаюзам і праўленьням калгасаў забясьпечыць поўнае ажыцьцяўленьне гэтай пастановы і правесьці шырокую растлумачальную кампанію праз агульныя сходы калгасьнікаў. Райкалгассаюзам пэрыядычна прапануецца ўтвараць праверку выкананьня гэтай пстановы.

Гэтая пастанова ўводзіцца ў дзеяньсць з 1 кастрычніка 1931 г.

Нам. Старшыні Праўленьня Калгасцэнтру СССР ТАТАЕЎ.

Выканаць плян сеназагатовак у тэрмін

Бялынецкі, Крычаўскі, Клічаўскі, Нараўлянскі, Чэрыкаўскі раёны паказваюць прыклад баявога выкананьня сеназагатовак

Ачысьціць сеназагатоўчы апарат ад клясава-варожага элемэнту

Браць раўненьне на раёны, якія перавыканалі пляны сеназагатовак

Сеназагатоўкі па БССР ідуць марудным тэмпамі. Гадавое заданьне на 10 верасьня выканана толькі на 54.6 проц. Крупскі раён выканаў гадавое заданьне толькі на 18 проц., Вузьдзенскі на 2 проц., Чавускі на 18 проц., Караліскі на 9 проц., Асьвейскі на 12 проц., Плешчаніцкі на 10 проц. і Рэчыцкі на 23 проц. Гэта тлумачыцца тым, што раённыя загатоўчыя арганізацыі ня здолелі паставіць сваёй работы на мясцох, не мабілізавалі ўвесь раённы і мясцовы актыў на сваячасовае правядзеньне сеназагатоўчай кампаніі.

Ёсьць рад раёнаў, якія свой гадавы плян сеназагатовак выканалі так: Бялыніцкі выканаў гадавы плян сена 112 проц., Крычаўскі на 172 проц., Клічаўскі на 199 проц., Нараўлянскі на 114 проц., Чэрыкаўскі на 111 проц. Яны па баявому арганізавалі раённыя арганізацыі і мясцовы актыў на правядзеньне сеназагатоўкі.

Адстаючым раёнам патрэбна заразжа ўзяцца за сеназагатоўкі. Трэба мабілізаваць увесь раённы і мясцовы актыў на баявое правядзеньне гэтай кампаніі. Што належыць тых, якія зрываюць пляны сеназагатовак, то павінны быць прыцягнуты да адказнасьці.

Цыбулькіна.

Нова-Дароскі і Кармазоўскі сельсаветы перавыканалі плян сеназагатовак

СТ. ДАРОГІ. (Белта). Гадавы плян сеназазагатовак выкананы па раёне на 53,4 проц. Уперадзе ідзе Нова-Дароскі і Кармазоўскі сельсаветы, якія пры шырокай мабілізацыі калгасьнікаў, беднякоў, серадлякоў, пры рашучым націску на кулацка-заможную частку вёскі—плян выканалі на 123 проц. Ганебна адстаюць Жнеўскі сельсавет, які выканаў заданьне на 2 проц., Пасецкі, які яшчэ не пачынаў выкананьне заданьня і Крывапасаўскі, які выканаў толькі на 11 проц.

Давесьці да кулацка-заможных гаспадарак цьвёрдыя заданьні па загатоўцы сена

У Крупскім раёне сеназагатоўкі пад пагрозай зрыву. Райспажыўсаюз несваячасова давёў плян да сельсаветаў. У выніку чаго па раёне плян выкананы на палову. Рад сельсаветаў не давялі плянаў да кулацка-заможных гаспадарак, а там, дзе ён і даведзен, дык цьвёрдыя заданьні не выконваюцца. Грушацкі сельсавет плян сеназагатовак выканаў на 0,0 проц. Гэта тлумачыцца тым. што сельсаветы не павярнуліся тварам да загатовак.

На в. Грушцы ёсьць 20 кулацка-заможных гаспадарак, а сельсаветам цьвёрдае заданьне не дадзена. Калгас «Чырвоны Востраў», замест сеназагатовак, разбазарвае сена на прыватным рынку. Раённыя арганізацыі не мабілізавалі ўсёй грамадзкасьці на сваячасовае выкананьне пляну сеназагатовак і не прыцягнулі да адказнасьці тых сельсаветаў, якія ганебна зрываюць пляны.

Веснавы.

Шмат сенажаці засталося ня ўбранай

Глускі раён мае жывёлагадоўчы напрамак, але пытаньнем стварэньня моцнай кармовай базы ніхто не займаецца. У раёне засталіся тысячы га нескошанай сенажаці. Загальшчына фактычна карміла ў мінулым усю жывёлу раёну. На сёньняшні дзень у саўгасе «Загальле» засталося ня ўбраным 4.000 га, па калгасам—звыш 5.000 га.

Раённае кіраўніцтва на словах за жывёлагадоўлю, а на справе нічога ня робіць па стварэньні моцнай кармовай базы. Да канца жніўня ніхто не пацікавіўся, каб сваячасова была праведзена ўборка сенажацяй. Ганебны правал сенаўборкі тлумачыцца адсутнасьцю працоўнай дысцыпліны па калгасах. Саўгасу «Загальле» ня была аказана належная дапамога, каб сваячасова закончыць уборку сена.

Сіласаваньне кармоў таксама зрываецца. Ёсьць шмат калгасаў, якія і на сёньняшні дзень ня думаюць прыступаць да сіласаваньня. Фактычна сіласаваньне ў раёне толькі пачынаецца, між тым, як сілосныя культуры і бульбянік пачынаюць сохнуць і чарнець.

Ёсьць небясьпека, што кіраўніцтва Глускага раёну праваліць важнейшую гаспадарча-палітычную справу стварэньня кармовай базы, як галоўнай прадпасылкі для выкананьня адозвы ЦК і СНК аб разгортваньні сацыялістычнай жывёлагадоўлі.

Февралёў.

Гарадокшчына зрывае сеназагатоўкі

ГАРАДОК. (Наш спэцкар.). Дагэтуль яшчэ няма ніякага пералому ў рабоце загатоўчых арганізацый Гарадокшчыны. Апартуністычнае спадзяваньне на самацёк прывяло да таго, што сеназагатоўкі правалены. Жнівеньскі плян сеназагатовак выканан толькі на 10 проц.: замест 70 тон, загатавана 7. Верасьнеўскія тэмпы ня лепшыя. На 8-е верасьня загатавана ўсяго 14 проц. пляну: 50 тон, з патрэбных 350.

Асноўнымі прычынамі гэтага прарыву зьяўляюцца наступныя: спазьненьне давядзеньня пляну да калгасаў, паселішч. Да абгаварэньня пляну ня былі прыцягнуты калгасныя і бядняцка-серадняцкія масы. Саладухінскі сельсавет зусім не давёў плянаў сеназагатовак да сваіх калгасаў, паселішч. Адсутнічае дастатковы нажым на кулацка-заможную частку вёскі па спагнаньні цьвёрдых заданьняў. У большасьці сельсаветаў ня створаны камісіі садзейнічаньня, а дзе яны існуюць —працуюць слаба. Вельмі слаба ідзе выкананьне пляну па аднаасобным сэктару; гэта тлумачыцца адсутнасьцю масавай работы, недастатковым уцягненьнем вясковага актыву. Вінаваты ў гэтым райкааплёнсаюз.

Па калгасным сэктары плян выкананы на 8 проц. Цьвёрдыя заданьні выкананы толькі на 35 проц. Межанскі, Зайкаўскі, Газьбінскі і Паташанскі сельсаветы выканалі плян сеназагатовак ад 2 да 3 проц., цьвёрдыя заданьні не даведзены да заможна-кулацкай часткі.

На прыёмных пунктах: ст. Бычыха, Езярышча і ў пункце Кабішча сена не прасуецца, у выніку чаго яно гніе. Між тым на ст. Гарадок стаіць 5 конных прэсаў у бязьдзейнасьці. У Вышадках 50 тон прэсаванага сена чамусьці не вывозіцца.

Л. Палеес.

У бой за паперу

Адвесьці пагрозу спыненьня фабрыкі „Спартак“

Рашуча адсеч ад папяровай прамысловасьці нарасты ведамственнай блытаніны

Ня раз пісалася і гаварылася аб фабрыцы «Спартак». Друк настойліва змагаўся за аднаўленьне згарэўшай часткі вытворчасьці, за бесьперабойную работу аднэй з буйных папяровых фабрык БССР.

На фабрыку ў Шклоў выяжджалі камісіі ЦКК і ЦК, шматлікія ведамственныя камісіі, нарэшце, паасобныя адказныя працаўнікі і г. д.

Сама фабрыка і раённыя партарганізацыі з часу чэрвеньскай катастрофы на фабрыцы ўпарта б'юцца за аднаўленьне за нармалізацыю сваёй роднай вытворчасьці. Дзесяткі тысяч рублёў патрачаны «Спартаком» на камандыроўкі ва ўсе канцы СССР за дапамогай і матар'ялам.

І ня гледзячы на тое, што пісалася і гаварылася, што былі камісіі, і аўтарытэтныя, — «Спартак» працягвае перажываць цяжкія дні. Над фабрыкай штодзень, як чорная хмара, навісае пагроза зачыненьня.

426 гадзін і 40 хвілін прастаялі папяровыя машыны ў жніўні з-за адсутнасьці сыравіны. 307 тон паперы, з-за гэтага не дадалі машыны.

У неадбудаваных цэхах працягваюць марнавацца рулоны каштоўнай паперы, псавацца дарагое абсталяваньне, а пад праліўным дажджом мокнуць людзі.

Хутка можа ўзьнікнуць новая пагроза..: Надыходзячыя халады могуць скаваць усю пара-сілавую гаспадарку. Вада і пара, праходзячыя па знадворных, няўцепленых трубах згарэўшых цэхаў — ня дойдзе да машын.

Могуць быць аварыі, можа спыніцца вытворчасьць.

Хто-ж вінаваты ва ўсіх гэтых цяжкасьцях, якія перажывае фабрыка?

Ці не пара ўдарыць па канкрэтных носьбітах зла?

Безадказныя заявы адказных прадстаўнікоў

24 жніўня на нарадзе пры рэдакцыі «Савецкая Беларусь» аб становішчы фабрыкі «Спартак» прадстаўнік Белдзяржбуду зусім аўтарытэтна заявіў, што будаўнічыя работы на фабрыцы будуць фарсыраваны, што рабочая сіла будзе накіравана. Як відаць, Белдзяржбуд прытрымліваецца маралі: «абяцанка-цацанка».

Прайшло больш 2-х тыдняў, а на «Спартаку» муляроў няма, будаўнічыя работы ідуць ранейшымі «чарапашымі» тэмпамі.

Ці зможа Белдзяржбуд адказаць, колькі сотняў і тысяч рабочых гадзін прапалі на будове ў Шклове і якая прадукцыйнасьць працы ў рабочых сэзоньнікаў.

Мы ўпэўнены што ня зможа.

А адказваюць самі рабочыя...

...Лятунства і цякучасьць рабочай сілы стала на «Спартаку» звычайным зьявішчам. Прадукцыйнасьць працы прагрэсыўна падае,—а самае асноўнае з усіх бед—гэта тое, што віхто ня ўпэўнен, што да зімы закончыцца будова.

Мы павінны спытацца ў Белдзяржбуду: «як кваліфікаваць разыходжаньне паміж словам і справаю?» Ці ня скромна будзе назваць гэта ашуканствам...

Белкаапсаюз можа паціснуць руку Белдзяржбуду...

24 жніўня вялікая нарада пры рэдакцыі. 25-га брыгада ў старшыні Белкаапсаюзу... Ня трэба было тады лішніх слоў і прыкрас...

Самі факты і голая вяпрыглядная сапраўднасьць гаварылі красамоўна за сябе. Беларускаму кааперацыйнаму цэнтру зрабілася вядома, што ў Шклове бываюць дні, калі няма хлеба, калі ня выдаюцца месяцамі прадукты згодна вызначаных норм, зрабілася вядома аб тым, што дзеці рабочых «Спартака» ня п'юць малака і нарэшце, што кааперацыя Шклову доўга перабудоўвае сваю работу.

У Белкаапсаюзе брыгада атрымала шмат абяцаньняў...

Няхай БКС ведае пра тое, што і да гэтага часу няма зьмен. «Усё па-старому» ў магазынах Шклоўскага гарспажыўтаварыства і рабочай сталоўцы.

Сыгналы з «Спартака» трывожна вястуюць аб прарывах у рабочым забесьпячэньні, аб цякучасьці рабочай сілы, аб адыходзе сэзоньнікаў назад у калгасы. Ці доўга Белкаапсаюз будзе праяўляць цярпімасьць да таго, што Шклоўская кааперацыя «перабудоўваецца»... цэлымі месяцамі, а аб'яднаньні Белкаапсаюзу не разгортваюць работы ў такіх правінцыяльных рабочых пасёлках, як Шклоўская фабрыка «Спартак».

Саюзпапера, Белпапера або „Бумснаб“...

Жнівень месяц павінен быў быць месяцам уздыму крывой вытворчасьці «Спартака». Праўда рухавікі капрызна працавалі і іх трэба было амаль штодзень рамантаваць. Ня ў лепшым стане катлы, варштаты і трансьмісіі старой канструкцыі. Але нават і пры гэтых ускладняючых абставінах былі ўсе даныя выканаць плян: было жаданьне лепшых ударнікаў аддаць усе сілы на выкананьне прамфінпляну і былі магчымасьці ўзьняць прадукцыйнасьць машын.

Аднак, Саюзпапера, Белпапера і «Бумснаб» у сваіх турботах аб фабрыцы забыліся пра адно... пра самую паперу.

«Спартак» задыхаецца ад адсутнасьці макулатуры і драўнінай масы. У жніўні фабрыка не атрымала 266 тон макулатуры і прышлося перавыдаткаваць сульфатную цалюлёзу. Гэта аказалася нявыгадным ні з пункту гледжаньня сабекошту, ні якасьці прадукцыі. У рэзультаце «турбот» папераб'яднаньня жнівеньскі прамфінплян выканан толькі на 75,5 проц. А першая дэкада верасьня не дае ніякай упэўненасьці ў стабілізацыі нават жнівеньскай лічбы, калі ня будзе рэзкага пералому ў забесьпячэньні сыравінай.

Да гэтага часу ня вырашана пытаньне аб Беларускіх рэспубліканскіх аб'яднаньнях «Саюзпаперы».

Рашэньне ВСНГ аб разузбуйненьні кіраўніцтва ў папяровай прамысловасьці не знайшло яшчэ практычнага пераламленьня ў канкрэтным кіраўніцтве нашымі фабрыкамі.

Гэта арганізацыйная блытаніна, матка ўсіх недахопаў: сыравіннага голаду, слабога тэхнічнага кіраўніцтва і маруднага ходу будаўніцтва.

Пытаньне, колькі месяцаў неабходна для вырашэньня пытаньня аб тым, што павінна рабіць «Белпапера»?

* * *

611.000 тон паперы павінна даць папяровая прамысловасьць краіны. Разгортваньне сеткі школ з шматмільённым ахопам працоўных, патрэбы нашай прамысловасьці і агульны культурны ўздым,—усё гэта ўладна патрабуе выкананьня вытворчай праграмы Савету Працы і Абароны.

Але апартуністычная практыка «папяровых» ведамстваў, зачараванае кола безгаспадарчасьці і нераспараджальнасьці — затармазілі выкананьне пляну.

Шмат пісалася аб папяровай прамысловасьці... Ці не пара праверыць, як выконваюцца дырэктывы і даныя абяцанкі.

...Праверыць і ўдарыць каго належыць...;

Гарын.

У-пралетарскую літаратуру ідуць новыя мастакі слова

Заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру праходзіць бяз удзелу нізавых арганізацый

ПІСЬМЕНЬНІКІ! Ваш абавязак паказаць краіне герояў пяцігодкі, гераічнае змаганьне за сацыялістычнае будаўніцтва

Іл. Барашка

Чарговыя задачы літаратурнага руху ў БССР

БелАПП—штаб пралетарскай літаратуры

У барацьбе з велікадзяржаўным шавінізмам, з нацыянал-дэмакратызмам, з дробна-буржуазнымі тэорыямі ў літаратуразнаўстве, у барацьбе за дыялектычны мэтад, за ператварэньне папутніка ў саюзьніка, Беларуская Асацыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў зрабілася баявым штабам пралетарскай літаратуры ў БССР.

Творча і ідэёва ўзрослыя пралетарскія пісьменьнікі і саюзьнікі пралетарскай літаратуры шчыльна падышлі да праблем нашага сацыялістычнага будаўніцтва, адлюстроўваючы яго ў сваёй творчасьці апошняга пэрыяду. Мы маем у нашай літаратуры паказ сёньняшняга дню, паказ калектывізацыі, клясавай барацьбы ў вёсцы, паказ жыцьця і змаганьня рабочых на прадпрыемствах БССР у рэканструкцыйны пэрыяд.

Праўда, у творчасьці часткі пісьменьнікаў яшчэ не наглядаецца глыбокага паказу нашай сучаснасьці, да гэтага часу існуе цэлая група твораў, напісаных схэматычна, ня глыбока, па вярхоўна. Але самы факт, што пісьменьнікі на сёньняшні дзень пераключыліся на актуальную тэматыку—факт станоўчы (хоць адна тэматыка яшчэ не сьведчыць аб пераключэньні ўсіх пісьменьнікаў на рэйкі пралетарскай літаратуры).

Пісьменьнікі павінны глыбей, паўней вывучаць усе тыя працэсы, якія адбываюцца ў нашай краіне, якія фармуюць новую сацыялістычную грамаду, новага чалавека. Савецкая грамадзкасьць дала магчымасьць амаль усім пісьменьнікам БССР вывучаць жыцьцё нашых новых будоўляў, нашых калгасаў, жыцьцё Чырвонай арміі, жыцьцё прадпрыемстваў БССР і СССР.

Мэтпрам, завод імя Ланцуцкага, «Герой Працы» у Добрушы, чашніцкія папяровыя фабрыкі, Бабруйскі лесапрацоўчы камбінат, Асінстан, Асінторф ды цэлы рад іншых прадпрыемстваў зьявіліся аб'ектамі вывучэньня пісьменьнікамі з мэтаю паказу іх у мастацкай літаратуры.

Працуючы ў інтэрнацыянальных брыгадах ВОАПП'у, некаторыя пісьменьнікі вывучалі жыцьцё і змаганьне пралетарыяту ў Данбасе, на Шатурцы, у Сярэдняй Азіі. Савецкая грамадзкасьць БССР у праве чакаць ад пісьменьнікаў твораў на найактуальнейшыя тэмы, якія паказалі-б ў мастацкіх літаратурных вобразах рост сацыялістычных элемэнтаў, клясавае змаганьне.

На сёньняшні дзень пралетарская літаратура ў БССР (як беларуская, так яўрэйская і польская) становіцца непарыўнай, непалучнай часткай агульна-пралетарскай справы—сацыялістычнага будаўніцтва. Кілёмэтры адставаньня літаратуры зьмяншаюцца надзвычайна шпарка. Аднак, гэта адставаньне на сёньня яшчэ ёсьць і ідзе галоўным чынам з-за адсутнасьці пісьменьніцкіх кадраў.

Заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру праходзіць слаба

Заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру, паказ рабочымі-ударнікамі іхняга змаганьня яшчэ ня даў тых вялікіх вынікаў, якія пралетарская грамадзкасьць чакае ад гэтай глыбока-палітычнай справы. Беларуская Асацыяцыя пралетарскіх пісьменьнікаў пачала праводзіць заклік рабочых-ударнікаў у літаратуру яшчэ з восені мінулага году. На буйнейшых прадпрыемствах БССР створаны рабочыя літаратурныя гурткі, якія павінны выявіць творцаў пралетарскага мастацтва з рабочых-ударнікаў. Работа ў літаратурных гуртках праходзіць нажаль яшчэ нездавальняюча. Імкненьні БелАПП-у ўзьняць работу ў літаратурных гуртках сустракае яшчэ да гэтага часу недаацэнку пралетарскага літаратурнага руху з боку нізавых арганізацый. Яшчэ на многіх прадпрыемствах да гэтага часу зрываюцца заняткі ў літгуртках па віне прафарганізацый, якія не дапамагаюць ім.

Нізавыя арганізацыі не разумеюць сутнасьці рабочага літаратурнага гуртка, які павінен зьяўляцца непарыўнай часткай прадпрыемства, ударнай мастацкай брыгадай на прадпрыемстве ў баёх за прамфінплян, у баёх за мабілізацыю рабочых на выкананьне заданьняў, пастаўленых партыяй перад кожным прадпрыемствам.

Адсюль і работа гуртка складаецца з актыўнага ўдзелу ў праводзеньні палітычных кампаній, удзелу ў насьценгазэце, шматтыражцы—не выданьнем раз у месяц абасобленай літаратурнай старонкі, а штодзённа, баявымі вершамі, апавяданьнямі, вытворчымі нарысамі, паказам герояў пяцігодкі, паказам адмоўных тыпаў рабочага асяродзьдзя—прагульшчыкаў, зрыўшчыкаў і г. д. Гэту работу літгурткі праводзяць у непарыўнай сувязі з прафэсыянальнымі арганізацыямі.

Трэба адзначыць на недастатковае кіраўніцтва і з боку БелАПП-у ў праводзеньні заклику рабочых-ударнікаў. Яшчэ да гэтага часу не наладжана сталая кансультацыя творчасьці пісьменьнікаў-рабочых, яшчэ да гэтага часу старонкі органу БелАПП-у—часопісі «Маладняк» занадта цесныя для прызыўніка і яго творчасьць яшчэ цяжка знайсьці ў часопісі.

Нашы іншыя літаратурныя часопісі—«Полымя» і «Узвышша» арыентуюцца выключна на пісьменьніцкія імёны і да гэтага часу іх рэдакцыі нічога не зрабілі, каб зьвязацца з нізавымі літаратурнымі гурткамі, пацікавіцца творчасьцю рабочых. Прызыўніку дзьверы ў гэтыя часопісі пакуль-што зачынены, у той час, як на старонках часопісаў сустракаюцца шкодныя, як літаратурныя, так і крытычныя творы. Гэты недахоп трэба зьнішчыць як мага хутчэй.

Надзвычайна малую работу ў справе заклику рабочых-ударнікаў правяло Беларускае дзяржаўнае выдавецтва. Яно выдала 1-2 кніжачкі рабочых-ударнікаў, у той час, як у РСФСР, на Украіне выданьне кніжок рабочых-ударнікаў прыняло шырокія разьмеры і выдавецтва асабліва зацікаўлены гэтай галіной работы літаратурных арганізацый. У нашым Выдавецтве мы павінны канстатаваць паўнейшы самацёк у этай галіне работы. Арганізаванай работы з рабочымі-ударнікамі няма. БДВ спадзяецца, што рабочы-ударнік сам прынясе гатовую прадукцыю ў рэдакцыйны партфэль. Аднак, гэта памылковая думка і яе трэба перамагчы канкрэтнай работай—стварыўшы пры БДВ рабочы рэдакцыйны савет—грамадзкую арганізацыю, выпрацаваць выдавецкі плян выданьня літаратуры прызыўнікоў, зьвязацца з літгурткамі БелАПП-у, заключыць дагаворы з пасобнымі аўтарамі.

Адно з дасягненьняў літаратурнага руху

Як адно з вялікіх дасягненьняў літаратурнага руху ў БССР мы адзначаем стварэньне ў Вышэйшым пэдагагічным інстытуце літаратурна-творчага аддзяленьня з задачаю кваліфікацыі пісьменьніцкага маладняка з рабочага і калгаснага асяродзьдзя.

Літаратурна-творчае аддзяленьне існуе ўжо другі год. Першы набор студэнтаў на літаратурна-творчае аддзяленьне, праведзены ўвесну гэтага году, паказаў вялікую цягу літаратурнай моладзі на вучобу.

У далейшым неабходна БелАПП-у, як кіруючай арганізацыі літаратурным рухам у БССР, яшчэ больш уважліва заняцца пытаньнем вучобы маладых пісьменьнікаў, плянава падрыхтоўваючы кадры ў літаратурных гуртках, праводзячы жорсткі клясавы адбор моладзі на літаратурную вучобу, узяўшы рашучы напрамак на павялічэньне рабочай часткі слухачоў аддзяленьня з ліку рабочых-ударнікаў, выявіўшых сябе ў літаратурных гуртках.

Нашы газэты і літаратура яшчэ ня зьвязаны паміж сабой

На вялікі жаль наш друк вельмі мала інфармуе грамадзкасьць аб літаратурным руху ў БССР. Недаацэнка гэтага пытаньня была адзначана як на партыйнай нарадзе пры Культпропе ЦК КП(б)Б, так і на пленуме БелАПП-у. Нашы газэты павінны больш рэгулярна даваць месца як артыкулам на літаратурныя тэмы, так і паасобным узорам творчасьці пісьменьнікаў. Было-б вельмі пажадана, каб газэты на сваіх старонках, нарэшце, загаварылі-б аб творчасьці такіх пісьменьнікаў, як М. Лынькоў, П. Галавач, А. Александровіч, Р. Мурашка, С. Баранавых і інш., правеўшы разам з чытачамі дыскусіі аб паасобных іх творах («Спалох на загонах», «Апошні зьверыядавец», «Межы», «Нараджэньне чалавека» і інш.).

З другога боку нашы газэты ў праве патрабаваць ад пісьменьнікаў літаратурных твораў, якія-б паказвалі герояў пяцігодкі. Па віне нашых літаратурных арганізацый, у першую чаргу БелАПП, па БССР паказ герояў пяцігодкі амаль-што не праводзіцца. Толькі паасобныя пісьменьнікі і паэты далі за апошні час у творчасьці такую тэматыку. Так'х пісьменьнікаў вельмі мала. Мы заастраем увагу пісьменьніцкіх арганізацый, і, галоўным чынам, БелАПП з сэкцыямі і філіямі аб мабілізацыі пісьменьніцкай думкі вакол гэтай праблемы.

Новае літаратурнае аб'яднаньне

Увесну гэтага году пакладзены пачатак арганізацыі новага літаратурнага аб'яднаньня—Усебеларускага Аб'яднаньня пралетарска-калгасных пісьменьнікаў. З вялікім спазьненьнем Аб'яднаньне разгортвае сваю дзейнасьць толькі цяпер. Асноўная задача Аб'яднаньня—работа па выяўленьні ў калгасах, камунах, сав. гаспадарках, МТС праз свае літаратурныя гурткі пісьменьніцкай моладзі.

З другога боку ў рэканструкцыйны пэрыяд зусім па іншаму пастаўлены задачы перад, так званымі, сялянскімі пісьменьнікамі. Сам тэрмін «сялянскі» у наш час ужо нічога не гаворыць. Між тым у БССР мы маем цэлы рад пісьменьнікаў, творчасьць якіх вызначалася нашай крытыкай, як творчасьць сялянскіх пісьменьнікаў. Як-раз у задачу новага Аб'яднаньня і ўваходзіць перавыхаваньне ў Аб'яднаньні гэтых пісьменьнікаў па новаму пралетарска-калгаснаму шляху.

У хуткім часе пачне выходзіць новая літаратурная часопісь—орган Аб'яднаньня. Яна павінна будзе зрабіцца зьбіральнікам маладых літаратурных сіл з сацыялістычнай вёскі.

Для разгортваньня работы Аб'яднаньня, для пасьпяховага выкананьня пастаўленых перад сабою задач, на дапамогу новаму Аб'яднаньню павінна прыйсьці наша савецкая грамадзкасьць, дапамагаючы стварэньню літаратурных гурткоў у раёнах і кіраўніцтву імі.

БелЛАЧАФ і задача абароны краіны

Больш актывізаваць сваю дзейнасьць павінна ў гэтым годзе Беларускае літаратурнае аб'яднаньне Чырвонай арміі і флёту (БелЛАЧАФ). Тая вялікая сетка літаратурных гурткоў па паасобных часьцях Чырвонай арміі вымагае ад БелЛАЧАФ-у больш сталага, жывога кіраўніцтва імі.

Пісьменьнікі—члены БелЛАЧАФУ павінны ў гэтым годзе даць нашаму чытачу творы на тэму аб абароне краіны, павінны паказаць быт чырвоных кашараў, паказаць герояў Чырвонай арміі.

Неадкладна БелЛАЧАФ павінен правесьці вялікую работу ў БССР па напісаньні пісьменьнікамі і самымі героямі грамадзянскай вайны твораў пра гераічнае змаганьне Чырвонай арміі за Савецкую Беларусь, якія павінны складаць асобную кнігу «Гісторыі грамадзянскай вайны», выданьне якой распачынаецца, паводле пастановы ЦК УсеКП(б), пад рэдакцыяй Максіма Горкага.

У сувязі з апошняй пастановай ЦК УсеКП(б) аб выдавецтвах, наша Беларускае дзяржаўнае выдавецтва павінна ў самы кароткі тэрмін «сабраць і арганізаваць вакол сябе ўсе новыя ўзрастаючыя аўтарскія сілы, дапамагчы ім узьняцца на больш высокую ступень культуры, ведаў і спэцыялізацыі».

Нашы літаратурныя аб'яднаньні, наша марксыцкая крытыка павінны весьці непаслабнае змаганьне з вялікадзяржаўным шавінізмам,—галоўнай небясьпекай на даным этапе, з беларускім контр-рэволюцыйным нацыянал-дэмократызмам. Мы павінны больш уважліва займацца пытаньнямі пралетарскай літаратуры нацыянальных меншасьцяў Савецкай Беларусі. Нядаўна адбыўся зьезд польскіх пралетарскіх пісьменьнікаў. Мы стаім напярэдадні ўсесаюзнай канфэрэнцыі яўрэйскіх пралетарскіх пісьменьнікаў. Мы павінны сабраўшы літоўскіх пралетарскіх пісьменьнікаў на канфэрэнцыю таксама ўзьняць на патрэбную вышыню дзейнасьць літоўскай сэкцыі БелАПП-у.

Вось рад задач, якія стаяць перад намі, ад правільнага вырашэньня якіх залежыць далейшы поступ пралетарскай літаратуры БССР па шляхох да гегемоніі.

Алесь Сячко

Слова ўдарніка

Нек пальцы так лёгка
На ходзяць з пяром,
Яны больш прывычны
да молата,
Але плёнам творчым
Бушуе нутро,
Палае жаданьнямі
моладасьць.
І працы,
Змаганьня
Бурлісты парыў
За якасьць,
за тэмпы
ударныя—
Эпоху індустрыі—
юнай зары
Гару апяваць песьняй
ўдарніка.
Запал свой іскрысты
Я прагну ўкаваць
У кожнае слова
і літару,
Каб верш, поэмы
Нам гмахі ўздымаць
Служылі дамкратнаю
сілаю.
Каб рыфмы ў цэхах зьвінелі,
Як сталь
Зьвініць пад ударамі
цяжкімі,
Каб пляны будоўлі выконваці
Звыш ста
Нат клічнікам кожным,
працяжнікам.
Каб вытворчасьць мастацкая
Нашых гадоў
Была зброяй моцнаю,
вернаю,
Нам трэба—ударнікам муру,
Станкоў
Уключыць свае
Тоны энэргіі.
Таму я так прагну
Парыўным нутром
Валодаць пісьменьніцкай
тэхнікай,
Каб нам сапраўды
Бальшавіцкім пяром
Адбіць гераічныя тэмпы.

13-VIII-31 г. Танежыцкая МТС.

С. Ліхадзіеўскі

Голас абрабаваных

Зняволілі—
хмурылі
бровы густыя.
Насадзілі асаднікаў—
зубы сьціскалі
моцна.
Вытраўлялі здароўе—
стагналі
і стыглі.
Гналі з працы—
глыналі мы ў роспачы
воцат.
Лупцавалі—
мы горкаю кроўю
харкалі.
Нэм акоўвалі рукі—
прытомнасьць
адходзіла.
Вядзіцё нас за краты—
паводкаю
шпаркаю
прашумела магутнае:
— Годзе вам!
Вам чуваць,
як з грымотнымі
ўзьлётамі
праляцеў грозны кліч
пазалотай
віў:
— «Не дамо аніводнага
злотага
ўраду
голаду
і вайны!»
Вы асьлеплі
ў шалёнай
агоніі,—
чырванець не падумае
і перад тым
шчака,
крывіць вусны як боль гарбаром
Смаргоні
і дачэсна скрыжоўвае рукі
беластоцкім
тэкстыльшчыкам.
«Нягуманнае»—
стрэнеце брэхам
і піскам,
і ахрысьціце ўраз
азьвярэлым,
нялюдзкім.
Прыгадайце-ж, паны,
дэмонстрацыі
ў Пінску
і катаваньні
ў Луцку!
Чалавек папрасіў
ў вас хлеба
чорствага—
дай у зубы яму,—
і за краты,
ў госьці.
Чалавек абвясьціў
свае думкі
проста—
загоняй яму голкі
пад бель
пазногцяў.
КАЖАЦЕ,
ГЭТА—
ГУМАННА?
Праз агонь кулямёту
ўцякаюць
у цёмныя ночы,
знэрвавана бягуць
праз дзяржаў
рубяжы...
Вам вядома,
чаго яны
хочуць?
Хочуць жыць!
Хо-о-чуць
жы-ыць!
З сінякамі
глухое тугі
пад вачыма,
абрабаваныя,
абяскроўленыя
да касьцей
хочам жыць, як жыве
пралетарская
айчына,
і расьці,
як краіна Саветаў,
расьце.
Можа й грымнеце
марш перамогі
зьнячэўку,
завіхурыцеся
ў фокстротах
дзівосных і ладных...
Мы-ж запомнім,
як жыў
бальшавік Канчэўскі,
як змагаўся
таварыш
Владэк.
Гэта—сьцяг!
Гэта—
маршу гром!
Гэта—заклік наперад
да дальніх
паходаў!
Сьціснем зубы...
Нянавісьцю
так шуганём,
што ў агні тым
вам стане
холадна!

Верасень 1931.

З. Півавараў

Гутарка з электраманцёрам

Мы ўключым электраток
Нават сонцу, дружа, не кажы
Каб электрычнасьць кожны глыток
Змог
іх
задушыць.
Дружа, багуць гады
Ня стрымаць
іх бег
адвечны
Я хачу
каб мае правады
Загаварылі
мовай чалавечай.
Не спалохаюць
бомбы,
міны
І суровасьць
замежных крат,
На нашай
станцыі
Адна толькі
турбіна
У сорак восем
тысяч
кілёват.
Чуеш рокат адвечны?
крантаў
стогн!
Яны падымаюць
на свае плечы
Мільёны
мільёнаў тон.
Ты ідзеш?
Бывай!
А мы ўключым электраток
Навт сонцу, дружа,
не кажы
Каб электрычнасьці
кожны глыток
Нашых ворагаў
за-ду-шыў.

Ленінград,
Белсэкцыя ЛАПП.

П. Галавач

Завод

Урывак з аповесьці „Спалох на загонах“

Над заводзкай брамай, як і многа год таму назад, вісіць старая, іржавая, пагнутая шыльда. Адна палова яе прыбіта над брамаю, а другую палову хтосьці адарваў і загнуў—заламаў яе.

Паска іржавае бляхі зьвісла над брамаю, яе прысыпала сьнегам. Яна памаленьку калышыцца ад ветру і страсае з сябе сьнег, стукаючы ў браму.

— Вось ужо ў каторы раз думаю адарваць яе,—кажа вартаўнік Мікода,—трывожыць яна мяне, усё здаецца, што нехта на завод прышоў ды стукае, але ўсё з галавы выходзіць. Вось так успомню, як застукае, потым зноў запамятаю.

Ён паз'рае, што Сідар з кастылём прышоў, круціць галавою і кажа:

— Наваяваў значыць? Быў чалавек, а цяпер што-ж, значыць? Што-ж табе вось за гэта будзе, што значыць, скалечылі цябе?.. З людзьмі—як з заводам. Быў завод, а цяпер двор пусты... Не разумею, значыць, я, што з гэтага будзе.

— Будзе тое, што завод заводам будзе, а я і без кастыля хутка пайду.

У драўляным доме, ранейшая кантора, зрабілі клюб. Над дзьвярыма, што на вуліцу, на шырокай дошцы намалявана слова «клюб» і яшчэ будынкі і коміны заводзк'я. Сідар заглядзеўся на шыльду клюбную, змоўк. Мікода з кішэні дастаў жменяй тытуну, чарпануў яе з далоні люлькай і пачаў па карабку чыркаць запалкай. Коўзаецца па карабку запалка, зьдзірае з карабка паперку, што намазана серкаю і не загараецца. Узяў запалку пальцамі бліжэй да галоўкі, намерыўся, чыркануў. Запалка не загарэлася, а зламалася.

— Цьфу, каб ты згарэла, запалкі люлэчай значыць, ня маем, каб чаго добрага...

Са злосьцю кінуў зламаную запалку ў сьнег, пачаў паціху чыркаць другой.

— А запалі, дык як дась у нос, значыць, дык да нутра пройдзе,—кажа ён.—Гэта клюб наш,—тлумачыць ён закурыўшы,—сходы тут розныя, мітынгі. Сыйдуцца бабы, крычаць, крычаць, значыць, што цяжка жыць, ды на тым і сядуць, а ў другі раз зноў пра тое-ж. Мікода пальцам уціскае памаленьку тытун у люльцы і прагна смокча люльку, а зацягнуўшыся, як мага глыбей, выганяе праз наздрыны дым.

— У цябе, дзядзька,—кажа Сідар, з наздрын дым ідзе як з фабрычнага коміну.

— З заводу ня ідзе дым, адказаў Мікода,—дык я, значыць, пушчаю так, каб людзі думалі, што з коміну гэта.

І рагоча выняўшы люльку з роту.

У двары, адразу за брамаю, складзкія будынкі заводу. Цяпер на складзе толькі паламаныя часткі варштатаў, ды кучаю рознае жалеза і дошкі. У складзе перабіраў драўляныя брускі столяр Клім. Ён узьняў галаву насустрач Сідару, адкінуў нагою брусок пад сьцяну і пашоў да Сідара, абціраючы палою падзьдзёўкі руку, каб павітацца. Кліма столяра Сідар даўно ведае. Звалі яго на заводзе ня проста Кл'мам і не па прозьвішчу, а «Клім-бацьвіньне». Сідар успомніў гэта і ветліва заківаў галавою Кліму, прыўзьняў шапку. Прыўзьняў шапку і Клім і, як падышоў, доўга трос Сідараву руку і ўсьміхаўся. Але загаварылі не адразу. Абое маўчалі, абое чакалі адзін ад аднаго пытаньня.

Мікода даў Кліму закурыць і пашоў у кантору. Тады Сідар, не дачакаўшыся пытаньня ад Кліма, хацеў запытаць:

— Ну. як-жа жывуць тут, а?—Але падумаў, што вельмі-ж не падыходзіць гэтае пытаньне і таму праказаў другое:

— Дык завод таго, абсеў, маўчыць?..

— Маўчыць,—адказаў Клім,—і мы ня жывем, а марнеем тут разам з ім... ня ведаю, як кажуць, што робяць і што мне рабіць, адным словам, як кажуць, не па майму ўсё ідзе... А ты мо' пабачыць завод прышоў? Хадзем, толькі ня будзе з чаго табе весялей. Яшчэ ў сталярным цэху тое-сёе робім. Ды час ад часу ў кавальскім... Завод..: аглоблі робім, драбінкі для калёс, барахло ўсялякае, як кажуць. У мадэльнай аглоблі робім!..

Мадэльная мясьцілася адразу-ж каля складу ў невялікім драўляным будынку. А было ў мадэльнай цяпер, пара верстакоў сталярскіх, ды каля сьцяны куча дошчак.

Сталярскі цэх мясьціўся гэтак сама ў асобным драўляным будынку, а пасярод двара даўгі нізкі будынак цагляны. Тут мясьціўся кавальскі цэх, ліцейныя, такарны і бляшаны.

У сьцягу, каля дзьвярэй ліцейн', валяюцца кавалкі жалеза, нейкія адлітыч даўно ўжо, дэталі машын. Сідар крануў жалеза кастылём, ачысьціў з яго сьнег і пазнаў дэталь, якую зрабілі для малатарні.

— Папрыбіраць варта, а то іржавее дарэмна так,—праказаў ён. Клім ня чуў. Ён шырока расчыніў дзьверы і чакаў Сідара.

У ліцейні ціха, халодна і пуста.

«Акурат, як у бараку тады,—думае Сідар,—кінулі, паўцякалі ўсе... няма каму даглядаць такога дабра...

«А як гэта той бляявы, што ён тады рабіў, як адзін застаўся? Яго пэўна перавялі ў другую больніцу, а мо' і другіх вярнулі зноў у барак?..»

У ліцейні, дзе калісьці шчыльна радамі стаялі адна ля другой формы, цяпер цямля чорная ўтаптана, па ёй параскіданыя валяюцца апокі. Яны паіржавелі, псуюцца. Ля сьцяны высокая круглая вагранка. Яна даўно, даўно астыла. І зусім л'шнім тырчыць ад яе капаўка. У ёй, на дне, застыў кавалачкамі даўні чыгун, а калісьці сюдэю цёк чыгун белым, малочным ручаём. Яго набіралі ў вёдры і тарошка бегаючы па ліцейні, разьлівалі ў формы. Гэта даўно было, а цяпер формы разбураны і вагранка астыла.

У вакне адным выбіта шыба. Праз дзірку вецер намёў у ліцейню сьнегу. Сьнег гладкім, хітрым зьвярком ляжыць на чорнай зямлі ліцейні, не баіцца, што хтось прыдзе і патрывожыць яго.

З даху вісяць закапцелыя канцы электрычнага шнура, без патронаў, без лямпачак.

— Як на могілках,—кажа Сідар. Яму сумна і чамусьці мацней, як калі. баліць нага. Клім нічога не адказаў на словы Сідара, аж пакуль не расчыніў дзьверы ў кавальскі цэх. Тады. як расчынілася халоднае і пустое нутро кавальскага цэху, ён азваўся:

— Як на могілках, браце...

І пасьля, прытрымліваючы Сідару дзьверы, дадаў:

— А вось і твой цэх, любуйся...

У Клімавым голасе злосьць.

— Чаго-ж тут любавацца,—адказаў Сідар,—плакаць варта-б.

— Я да таго і кажу,—згадзіўся Клім,—бо радасьці вялікае, як кажуць, няма з усяго гэтага. Некалькі горнаў гэтымі днямі працавалі. тое-сёе раман туем сялянам... Завод зьвялі да вясковай кузьні... Цьфу..:

Шарэнгаю стаяць халодныя горны. І яны ўжо даўно патухлі. Сідар памятае свой горан, вось той у самым куце. У горне колісьня дробныя вугалькі ўжо з пяском зьмешаны, хтосьць насыпаў у горан жоўтага пяску. Сідар пальцам капнуў вугальля. Яно шчыльна зьляжалася. Калі ўзяў вугаль у пальцы, убачыў, што ён зусім ужо абцёрся, пальцы ў сажу ня мажуцца.

Каля горану кувалда. На зямлі ля кувалды невялічкія кавалкі іржавага жалеза. Зьверху на кувалдзе іржавыя жоўтыя плямкі.

— Вугальля нават няма,—кажа Клім,—а то-б мо' што і зрабілі.

Пасярод цэху невялікі паравы малаток. Ім кавалі большыя рэчы. Цяпер ён дзюбу сваю тупую падабраў, схаваў у нутро сваё:

— Як на могілках,—паўтарае цяпер ужо словы Сідара Клім.

— Усё мярцьвецкае, што-ж ён вось малаток гэты бяз пары, бяз пасу...

— Як у нас у мярцьвецкай было,—гаворыць за ім Сідар,—цёмна, халодна і цішыня. Ляжаць людзі, ды няжывыя, не шавеляцца...

Зноў, яшчэ мацней, баліць Сідарава нага, кволасьць па целу распаўзаецца і млоснасьць. Клім угадвае настрой Сідараў і адводзіць яго ад горана.

— Хадзем у бляшаны,—кажа ён,—там робяць. Гэта, як кажуць, самы жывучы цэх у нас... ведры, даёнк', кошыкі робяць і прадаюць, бляхі ў нас пакуль што хапае...

У бляшаны Сідар адмовіўся ісьці. З кавальскага выйшлі на двор. Клім пачаў закурваць. Закурваючы загаварыў:

— А ад такарнага нічога амаль не засталося. Варштакі палякі пазабіралі пры адыходзе, ня было тут каму перашкодзіць ім.

Клім лізнуў кончыкам языка паперку папяросную, правёў па папяросе пальцам, каб прыклеілася паперка і патрымаўшы папяросу ў зубах, узяў яе не закурыўшы зноў у пальцы і канцамі пальцаў закруціў кончык папяросы, каб табак ня высыпаўся.

Закурыў Кл'м як вышлі з заводзкага двара на вуліцу і, закурыўшы, загаварыў, пазіраючы ў зямлю.

— Ты, Сідар, ня злуй, але я, як кажуць, свае мыслі табе некаторыя вы кажу... Недарасьлі мы, як мне гэта думаецца, да таго яшчэ, каб самім усё зрабіць. Яно-то, як кажуць, вальней, самі мы гаспадары, але-ж у мяне сем'я не, як кажуць, карміць трэба, а з чаго-ж я пакармлю яе? Так што і выходзіць, як кажуць, відзімасьць адна з усяго гэтага. Што-ж мы гаспадарым без заводу, без гаспадаркі, як кажуць... Ты-ж зірні, — ён паказаў на заводзкі двор, я, яно, мо' і стары крыху для ўсяго гэтага, можа шмат чаго і не разумею, але я падыходжу, як кажуць, з таго боку да ўсяго, што карміць мне цэлую плойму трэба... А як-жа я буду падыходзіць?..

Сідар пазіраў праз расчыненую фортку на заводзкі двор. Двор сьнегам глыбокім замецены, пазамятаў сьнег усе ранейшыя сьцежкі, што былі на двары. Цэлыя гурбакі сьнегу і на дахах. Усё замецена.

— Багата работы трэба,—кажа нібы сам сабе Сідар.

— І грошай багата,—дадае Клім,—ой, як багата грошай трэ' будзе...

— Яно так...

— А то як-жа. Адбяры ў чалавека ўсё, пакінь з голымі рукамі, дык ён што-ж? Ні пры чым ён тады, пакуль хто работы ў рукі ня дасьць.... І з заводам тое-ж... Ні жалеза, ні вугальля, ні варштакоў...

— А хто галоўны ў нас цяпер на заводзе?—Нечакана для Кліма спытаў Сідар.

— Галоўны-то ёсьць, але што-ж з таго, глядзіць толькі, каб не раскралі чаго.... ну, ды такі-сякі заказ прыме. Тут ён і ўвесь наш галоўны, як кажуць...

Гэтак-жа нечакана, як загаварыў пра галоўнага, Сідар і разьвітаўся. На разьвітаньне Клім запрапанаваў:

— Прыходзь часьцей цяпер, будзем, як кажуць, рабіць што кольвеч.

— Буду, буду прыходзіць... Трэба будзе рабіць, каб завод пашоў.

— Наўрад?

— Чаму наўрад? Сыйсьціся, пагутарыць, ды рабіць нешта...

— Дык што сыйсьціся? Не такія за воды сталі, а тут... Баюся я, каб не зачынілі зусім, як кажуць, нашае крамкі..:

— Не зачыняць, пойдзе.

— Дай бог, як кажуць, чутае бачыць... Х'ба мо', калі-б узяцца гэта..:

Паціху, абапіраючыся на кастыль, Сідар пашоў пасярод вуліцы. А Клім пастаяў каля форткі і зноў вярнуўся ў заводзкі двор.

———

У пакой да Сідара Клім забег проста ад работы. У пальцах ён трымаў даўгую, скручаную спружынаю жалезную стружку. Стружку, як падышоў, кінуў на стол перад Сідарам.

— Нашыя палуднуюць ужо,—прамовіў ён.—Я што трэба зрабіў, а цяпер за ячэйкай чарга.—Узяў зноў са стала стружку, пакруціў яе ў пальцах і сагнуў. Стружка разламалася адразу на тры кавалкі. Клім кінуў іх зноў на стол на паперы, якія ляжалі перад Сідарам. Сідар скінуў стружку на памост.

— Ты што мне сьмецьцё робіш?

— А, запамятаў, што стружка. Дык ты прыходзь зараз-жа пасьля поўдня.—Сказаў гэта, пастаяў хвіліну штосьці ўспамінаючы і вышаў.

Насупраць вакна вялікі забудаваны пляц. Яшчэ ўвесну мінулага году пляц пуставаў. На пляцу пасьвілася чыясь карова, ды яшчэ хадзілі пад наглядам дзяцей дзьве гусі і гурбамі гулялі дзеці. Пляц зелянеў густой маладой муравай. Гусі шчыпалі мураву жоўтымі дзюбамі, часта схілялі нізка над самай муравай свае белыя даўгія шыі і, выцягваючы іх на ўсю даўжыню, сіпел' ў бок да дзяцей.

Улётку пляц ымералі, абгарадзілі шчыльным плотам з дошчак—адпіловак і пачалі вазіць на пляц цэглу, жалезныя рэйкі і лес. Тады-ж і пачалі закладку падмуркаў для новых заводскіх цэхаў. А пазьней усё лета на пляцу вяліся работы, з кожным днём усё вышэй і вышэй ўздымаліся новыя заводзкія сьцены.

Сідар амаль кожны дзень бываў на пляцы і, ня гледзячы на гэта, ён заўжды, як ішоў пасьля работы да дому, спыняўся ля плоту і праз вузкія шчыліны паміж дошчак, падоўгу пазіраў на пляц. За плотам доўга рабілі падмуркі. Пасьля доўга, так здавалася Сідару, выводзілі сьцены. Сьцены паступова вырасталі. Сьцягвалі прастор пляцу ў няправільны, абсечаны трыкутнік і поўнілі пляц сваёй сьвежаю чырванью. Падглядаў Сідар на пляц праз плот, аж пакуль ня выглянулі з-за плоту на вуліцу самі сьцены. Тады ў яго зьявілася другая звычка. Калі трэба было ісьці каля пляцу, Сідар паціханьку ішоў ходнікам, каб бачыць адтуль будоўлю. Ідучы сачыў за кожным хто шоў па ходніку, сачыў, як той пазірае на будоўлю. Калі ідзе хто і сьцішыць хаду, пазіраючы на будоўлю, Сідар тады не ў заметку далучыцца да незнаёмага, пойдзе поруч з ім і запытае, паказваючы на пляц:

— Што, падабаецца?

І калі незнаёмы пытаўся, што там будуецца, Сідар ахвотна тлумачыў:

— Завод, новы завод. Вунь бачыш,—гаварыў ён, спыняючы незнаёмага, каб паказаць на стары заводзкі двор,—там стары завод і не завод, а хутчэй майстэрня, а гэта новыя цахі будуюцца.

Сідар спыняўся поруч з незнаёмым і разам з ім, нібы таксама ўпяршыню, любаваўся вялікай будоўляй, заўжды знаходзячы ў ёй штосьці новае, чаго да гэтага не заўважаў.

Цяпер зіма. На пляцу маўклівыя, засьнежаныя будынкі новага заводу. Над прасторнымі іхнымі сьценамі стаялі даўгія кроквы. З-за гораду на новы заводзкі двор прыходзіць мяцельны вецер. Ён падоўгу блукае па-над пустым дваром, шыецца ў рыштаваньні, злосна сьвішча, заблудзіўшы там, а, вырваўшыся, ганяе пад кроквамі сьнеговыя белыя табуны.

— Пазіраеш на новы? Сідар уздрыгануў і адвярнуўся ад вакна.

— На новы ўгледзіўся?—Зноў запытаў Панас.—Ну, як вырашылі?

— Паедзеш, усе згодны.

— Ну, вось і добра. Дык я пасьлязаўтра і паеду.

— Хочаш у такарны на мітынг?—Запытаў Сідар,—ультыматум ліцейні прад'яўляць будзем.

— Я не палуднаваў яшчэ. У цябе кажух добры...

— Дык што з таго?

— А так, нічога, добра-б было ў ім пасхаць.

— Вунь куды ты гнеш. Падумаю, можа і дам.

Панас кінуў Сідару галавой, зьбег з высокага ганку і гэтак-жа подбежкам пайшоў праз двор да сталовай.

Пазыку 3 рашаючага — у масы

У рэалізацыі пазыкі вёска не павінна адставаць ад гораду

Плян рэалізацыі пазыкі па аднаасобным сэктары выкананы на 25,2 проц. Гэта ганебная лічба. Сваячасовым афармленьнем падпіскі, унясеньнем першых узносаў— замацаваць дасягненьні ў рэалізацыі пазыкі

Апэрацыйная зводка рэалізацыі па БССР пазыкі „3-га рашаючага“ на 10 верасьня

(Паводле вестак НКФ БССР)

Усяго на 10 верасьня па БССР рэалізавана пазыкі на суму 36.640 тысяч руб., што складае 93 проц. пляну рэалізацыі.

Па групе рабочых і служачых плян рэалізацыі перавыканан на 12,7 пр., а па іншых групах гарадзкога насельніцтва плян рэалізацыі пазыкі выканан на 98 проц.

Горш абстаіць справа рэалізацыі пазыкі на вёсцы, асабліва сярод аднаасобнікаў. Калі па калгасным сэктары рэалізавана 96 проц. пляну, дык па аднаасобным сэктары плян рэалізацыі пазыкі выканан толькі на 25,2 проц. Такім чынам агульны плян рэалізацыі пазыкі па калгасным і аднаасобным сэктары выканан толькі на 57,2 проц.

Значна горш абстаіць справа з афармленьнем падпіскі на пазыку і ўнясеньнем узносаў.

Па гарадох з агульнай сумы падпіскі ў 29.027 тысяч руб. афармлена 22.415 тыс. руб., або 77,0 проц., а паступіла ўзносаў 2.409 тысяч руб. Па калгасным сэктары з рэалізаванай сумы ў 5.773 тыс. руб., афомлена толькі 1.780 тыс. руб., або 30,8 проц. пляну. Паступіла ўзносаў па калгасным сэктары 280 тысч руб.

Па аднаасобным сэктары прадана за наяўны разрахунак аблігацый пазыкі на суму 975 тыс. руб.

Усяго па БССР афармлена падпіскі на пазыку (па горадзе і вёсцы) 69,5 проц. ад рэалізаванай сумы і паступіла ўзносаў 3664 тыс. руб.

Замацаваць дасягнутыя посьпехі ў рэалізацыі пазыкі

З атрыманых НКФБ з Магілеву вестак аб афармленьні падпіскі на пазыку «3-га рашаючага году пяцігодкі», відаць, што па Магілеўскім раёне сума падпіскі ў працэсе афармленьня зьменшылася на 350 тысяч рублёў. У тэлеграме, праз якую паданы гэтыя весткі, ёсьць прыпіска аб тым, што падрабязнасьці зьмяншэньня падпіскі па групе рабочых і служачых будуць паведамлены дадаткова. Як відаць у пісьмовых тлумачэньнях будуць паданы «аб'ектыўныя» прычыны, па якіх лапушчана гэтае памяншэньне падпіскі.

Але сам факт памяншэньня падпіскі па групе рабочых і служачых ніякіх дадатковых тлумачэньняў не патрабуе. Гэты факт яскрава паказвае на тое, што Магілеўскія раённыя партыйныя, савецкія і прафэсыянальныя арганізацыі не цікавіліся ходам кампаніі рэалізацыі пазыкі, а фінансава-крэдытныя ўстановы пусьцілі гэту работу на самацёк.

Замест мабілізацыі шырокіх пралетарскіх мас на поўнае выкананьне заданьня па рэалізацыі пазыкі замест згрупаваньня вакол гэтай кампаніі шырокай праелетарскай думкі і наладжваньня апэрацыйнага кіраўніцтва арганізацыі і ўстановы, якія павінны былі праводзіць гэтую кампанію, займаліся «очковтирательством». Яны няправільна інфармавалі вышэйшыя органы аб ходзе кампаніі, давалі да самага апошняга часу заведама хлусьлівыя зьвесткі і тым самым прыкрывалі сваю апартуністычную бязьдзейнасьць у правядзеньні кампаніі па рэалізацыі пазыкі.

Такім чынам па групе рабочых і служачых атрымаўся недачот на 350 тыс. руб., а па індывідуальна-сялянскіх гаспадарках рэалізавана замест 227 тыс. руб., ўсяго толькі 11 тыс. руб.

Гэты факт з надзвычайнай сур'ёзнасьцю сыгналізуе аб небясьпецы прарыву на адным з галоўных вучасткаў фінансавага фронту ў Магілеўскім раёне.

Аднак, аналёгічныя факты сустракаюцца ў практыцы работы не адных толькі Магілеўскіх «фінансістаў». Гэтая небясьпека становіцца яшчэ больш выразнай, калі прыняць пад увагу, што з рэалізаванай у БССР пазыкі ў суме 36.640 тыс. руб. афармлена пакуль-што толькі 24.195 тыс. руб., або 66 проц., прычым па групе рабочых і служачых падпіска афармлена на 77 проц., а па калгасным сэктары ўсяго толькі на 30 проц.

Дзякуючы такому надзвычайна нізкаму проценту афармленьня падпіскі ў дзяржаўны бюджэт атрымліваецца недабор паступленьняў па чарговых узносах у суме каля 2 млн. руб. па рэалізацыі пазыкі толькі ў горадзе.

Справа ў тым, што шмат якія раёны і асабліва такія як Уваравіцкі, дзе падпіска афармлена ўсяго толькі на 2,5 проц., а па калгасах і зусім яшчэ не афармлена, Краснапольскі раён, дзе падпіска афармлена толькі на 19,4 процанта, Касьцюковіцкі — на 8,6 проц., Койданаўскі — на 20,2 проц. (раён, які прэміраваны за лепшую рэалізацыю), Лёзьнянскі 24,8 проц., Заслаўскі—32,6, Гарадокскі—31,4 проц., Быхаўскі — 34,3 проц., і г. д., як відаць проста не даацэньваюць усёй важнасьці кампаніі. Яны спадзяючыся на самацёк як у падпісцы, і асабліва ў афармленьні, правалілі кампанію на самым адказным яе этапе—забесьпячэньні рэальных вынікаў кампаніі.

З вуроку Магілева неабходна зрабіць кожнаму раёну, кожнаму з паасобных фінансавых работнікаў вывад аб неабходнасьці праверкі ходу работы па рэалізацыі і афармленьню пазыкі, правільнасьці вучоту падпіскі, правільнасьці інфармацыі.

У часе афармленьня, падпіска на пазыку павінна быць ня толькі поўнасьцю афармлена, але гэты этап работы павінен забясьпечыць далейшае павялічэньне рэалізацыі. Зараз яшчэ цэлы рад раёнаў, як напрыклад, Аршанскі, Віцебскі, Гомельскі, Клічаўскі і гэтак далей, якія поўнасьцю выканалі заданьне па рэалізацыі і афармленьню падпіскі, але і ў гэтых раёнах ёсьць яшчэ рад прадпрыемстваў і ўстаноў, дзе падпіскай на пазыку ахоплены ня ўсе рабочыя і служачыя. На радзе прадпрыемстваў і ўстаноў гэтых раёнаў месячны фонд зарплаты падпіскай не ахоплены.

Ёсьць цэлы рад прыкладаў, калі ў некаторых калгасах яшчэ і да гэтага часу падпіска на пазыку зусім не праведзена. Асабліва дрэнна праходзіць рэалізацыя і афармленьне сярод аднаасобнікаў. Тут заданьне выканана ўсяго толькі на 25 проц.

У паасобных раёнах ёсьць факты перагібаў у правядзеньні гэтай кампаніі, адміністраваньня, якое выявілася ў даведзеньні цьвёрдых заданьняў па падпісцы на пазыку да серадняцкіх гаспадарак (Бягомльскі, Чачэрскі раёны).

Фінансава-крэдытны апарат павінен рашуча перабудаваць сваю работу такім чынам, каб разам з наладжваньнем сапраўднага апэрацыйнага кіраўніцтва ходам кампаніі, ён змог забясьпечыць сапраўдны кантроль рублём за выкананьнем фінплянаў паасобнымі ўстановамі і арганізацыямі.

Апартуністам і ачкаўціральнікам з Магілеву павінен быць даны жорсткі адпор. Гэтак-жа рашуча трэба ўдарыць і па тых, раёнах, якія спрабуюць сваю бязьдзейнасьць пакрыць адміністраваньнем, перагібамі і г. д.

Разам са 100 проц. ахопам падпіскай на пазыку ўсіх працоўных гораду ўся ўвага грамадзкасьці і фінансава-крэдытных органаў павінна быць накіравана на пасьпяховае распаўсюджаньне пазыкі па вёсцы, асабліва сярод аднаасобнага сэктару, з тым, каб у бліжэйшы час на вёсцы скончыць кампанію рэалізацыі пазыкі.

Высокія тэмпы работы павінны забясьпечыць пасьпяховыя вынікі кампаніі рэалізацыі і афармленьня пазыкі. У справе забесьпячэньня рэалізацыі пазыкі на вёсцы сярод аднаасобнікаў вялікую ролю павінны адыграць грамадзкія арганізацыі (МОПР, АСО, Аўтадор і інш.), якія ўзялі на сябе абавязак праз свае ячэйкі на мясцох распаўсюдзіць поўную суму пазыкі сярод аднаасобнікаў. Гэтым арганізацыям з боку ўсёй грамадзкасьці і ў першую чаргу з боку фінансава-крэдытных устаноў павінна быць забясьпечана максымум дапамогі ў іх рабоце.

Рабцэвіч.

Пастанова Прэзыдыуму Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР

аб чарговай справаздачнай кампаніі саветаў

Прэзыдыўм Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **пастанаўляе:**

1. Правесьці з 20-га кастрычніка па 10-е лістапада г. г. справаздачную кампанію саветаў БССР, а з 1-га па 10-е кастрычніка правесьці папярэдні масавы агляд работы саветаў.

2. Праверка работы саветаў і самая справаздачная кампанія павінны яшчэ больш узьняць ролю саветаў, як праваднікоў і барацьбітоў за генэральную лінію партыі, узмацніць саветы, як органы пралетарскай дыктатуры, яшчэ больш замацаваць кіруючую ролю рабочае клясы ў сацыялістычным будаўніцтве і паказаць на справе, што калгасьнік зьяўляецца асноўнай і сапраўднай апорай рабочае клясы ў вёсцы; справаздачная кампанія павінна зьявіцца новым руйнуючым ударам па клясава-варожым, кулацка-нэпманоўскім элемэнтам у горадзе і вёсцы і іх агентуры ў партыі—правым ухілістам і праваму ўхілу, як галоўнай небясьпекі на дадзеным этапе, а таксама павінна паслужыць для барацьбы супроць «левых» загібаў. Гэта кампанія павінна праходзіць пад пунктам погляду перабудовы работы саветаў на выкананьне прамфінпляну ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі, узмацненьне палітычна-гаспадарчых кампаній, як загатоўкі, выкананьне фінпляну, правядзеньне ўсеагульнага навучаньня і г. д., за арганізацыйна-гаспадарчае замацаваньне саўгасаў, калгасаў, за прыліў ў існуючыя калгасы і арганізацыю новых калгасаў, за завяршэньне суцэльнай калектывізацыі да канца 1932 году і на гэтай базе ліквідацыі кулацтва як клясы.

Шырока разгортваючы крытыку і самакрытыку, асабліва ў час справаздачнай кампаніі саветаў, ажывіць і ўзмацніць дзейнасьць сэкцый саветаў, дэпутацкіх груп, груп беднаты на падставе апошніх пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б.

Справаздачная кампанія не павінна паслабляць, а наадварот павінна значна ўзмацніць вырашэньне ўсіх палітычна-гаспадарчых кампаній, якія зараз праводзяцца саветамі. У час справаздачнай кампаніі трэба зьвярнуць ўвагу на практыку выкананьня дырэктыў аб ажыцьцяўленьні ленінскай нацыянальнай палітыкі, у прыватнасьці аб абслугоўваньні нацменшасьцяй на іх роднай мове, даючы руйнуючы адпор вялікадзяржаўнаму шавінізму, як галоўнай небясьпецы, беларусакму нацдэмакратызму і іншым шовінізмам.

3. Даручыць прэзыдыумам РВК распрацаваць канкрэтныя пляны праверкі работы сельсаветаў і справаздач перад выбаршчыкамі, забясьпечыўшы ўцягненьне ў гэтую работу ўдарнікаў заводаў, саўгасаў і калгасаў, а таксама і грамадзкіх арганізацый. Трэба арганізаваць справаздачу членаў саветаў перад выбаршчыкамі, паставіць пытаньне аб перавыбарах неапраўдаўшых сябе дэпутатаў, аб ачыстцы саветаў ад апартуністаў, няздольных змагацца за генэральную лінію партыі, за бальшавіцкія тэмпы работы. У гэтую кампанію на мясцох трэба ўцягнуць членаў ЦВК БССР і членаў РВК.

4. Паставіць пытаньне перад ЦСПСБ і ЦК ЛКСМБ аб шырокім удзеле ў гэтай кампаніі камсамолу і профсаюзных мас.

5. Даручыць рэдакцыі «Савецкая Беларусь» і ўсім цэнтральным і раённым газэтам асьвятляць ход праверкі работы і справаздачы саветаў, мабілізуючы масы на вырашэньне асноўных пытаньняў работы саветаў.

6. Арг.-Інстр. Аддзелу Прэзыдыўму ЦВК БССР распрацаваць канкрэтную інструкцыю аб практычным ажыцьцяўленьні гэтай пастановы і ўнесьці яе на зацьверджаньне Сакратарыяту ЦВК.

7. Адзначаючы важнасьць справаздачнай кампаніі, даручыць РВК забясьпечыць правядзеньне яе ў паказаны тэрмін..

8. Абавязаць райвыканкомы, пад адказнасьць старшынь, праз 10 дзён насьля скончэньня кампаніі прадставіць дакладныя матар'ялы Арг.-Інструктарскаму Аддзелу Прэзыдыўму ЦВК. Вынікі справаздачнай кампаніі па БССР заслухаць на Прэзыдыўме ЦВК у пачатку лістапада месяца.

Старшыня Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **А. Чарвякоў.**

Вык. аб. Сакратара Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту БССР **Б. Вансоўскі:**

15 верасьня 1931 г.

Гнёзда цемрыператварыць у ачагі асьветы

Рэзалюцыя агульнага сходу рабочых і служачых друкарні імя тав. Сталіна

Пасьпяховы ход сацыялістычнага будаўніцтва ў краіне, дзе будуецца сацыялізм, рост культурных запатрабаваньняў рабочае клясы, выкананьне пяцігодкі ў 4 гады і шырокі калгасны рух, які ў збожжавых раёнах дасягнуў суцэльнай калектывізацыі і набліжэньне калектывізацыі па БССР да 50 проц., ушчэнт разьбіваюць хлусьню і агітацыю клерыкалаў кулака і іх дапаможнікаў аб немагчымасьці выкананьня гэтых тэмпаў.

Расьцуць культзапатрабаваньні рабочае клясы, пашыраецца сетка навучальных і культустаноў, канчаткова ліквідавана няпісьменнасьць. Мы рыхтуем сабе кадры з рабочае клясы для нашых фабрык і заводаў.

Недахоп памяшканьняў для культпатрэб на сёньняшні дзень вельмі адчуваецца. Побач з гэтым будынкі рэлігійнага культу, як сабор і 10 сынагог, яшчэ знаходзяцца на службе ў кулака і акрамя таго, што ніякай карысьці рабочай клясе не даюць, а наадварот прыносяць шкоду. Працоўныя ўжо даўно парвалі рэлігійныя путы. Царквы, касьцёлы і сынагогі ўжо не наведваюцца.

Агульны сход рабочых і служачых друкарні імя Сталіна, каб культурна скарыстаць пустуючыя памяшканьні, патрабуе ад Менскага гарсавету перадаць царквы, сабор і 10 сынагог на культурныя патрэбы працоўных Менску і прыстасаваць іх пад культустановы. Перадачу гэтых памяшканьняў мы патрабуем зрабіць як найхутчэй. Гэтыя памяшканьні павінны зараз-жа быць уключаны на барацьбу за прамфінплян.

Прынята аднагалосна на агульных цэхавых сходах друкарні.

АПАВЯШЧЭНЬНІ

21-IX—роўна, а 7-й гадзіне ўвечары ў памяшканьні ЦП Саюзу Працасьветы адбудзецца нарада Сацыяльна-бытавога сэктару ЦП Саюзу па пытаньні рэалізацыі пастановы ЦК УсеКП(б) пра матар'яльна-прававое становішча асьветнікаў.

На нараду павінны зьявіцца: дабраахвотнікі сэктараў, кір. сац.-бытав. групамі Менскіх ГК і МК.

Запрашаюцца старшыні МК і ГК і прафактыў».

19-га, а 7 гадз. увечары ў пэдагібнэце склікаецца нарада грамадавеллаў школ сацвыху, рабочых школ, рабфакаў, фабзавучаў і тэхнікумаў.

Яўка абавязкова.

Гарінспэктура.

Адказны рэдактар П. ШАСТАКОЎ.

Бульбу і гародніну—пралятарскім цэнтрам

НЕАДКЛАДНА РАЗГАРНУЦЬ МАСАВУЮ КОПКУ БУЛЬБЫ

Пераапрацоўцы садавіны і гародніны—максымальная ўвага

559 тон у пяцідзёнку —гэта вельмі мала

Паводле вестак упаўнаважанага Цэнтрасаюзу, па бульбазагатоўках за пяціднёўку з 10-га па 15-га верасьня, загатоўлена 559 тон бульбы, з якіх адгружана Ленінграду 112 тон.

Першымі па адгрузцы ідуць Быхаўскі райспажыўсаюз, які адгрузіў Ленінграду 5 вагонаў бульбы і Бабруйскі райспажыўсаюз—2 вагоны.

Бульбазагатоўкі пад пагрозай

Гарадок. (Наш спэц. кар.). Паводле намечанага раённага пляну, капаньне бульбы павінна было пачацца 10-15 верасьня. Але-ж арганізацыі раёну да гэтай кампаніі не гатовы: Многімі калгасамі яшчэ не распрацаваны рабочыя праграмы Калгасцэнтру, Райкалгассаюз і МТС ня цікавяцца набыцьцём і разьмеркаваньнем бульбакапалак. Ёсьць магчымасьць атрымаць з Віцебскага заводу «Мэтпром» № 3—20 бульбакапалак. Але самацёчныя настроі так «заелі» работнікаў гэтых арганізацый, што яны ніякіх захадаў ня прымаюць да атрыманьня бульбакапалак.

Бульбакапалкі, якія прыбываюць на станцыю Гарадок чамусьці доўгі час там ляжаць і не накіроўваюцца ў патрэбныя месцы. Да гэтага трэба дадаць, што яшчэ ня складзены брыгады па капаньні бульбы. Усё гэта ставіць пад пагрозу сваячасовае правядзеньне бульбазагатовак.

Л. Палеес.

Зьнішчыць нядбайныя адносіны да сушкі бульбы

Сушыльны завод у Менску працуе ў сучасны момант на 3 зьмены. Зараз ідзе сушка садовіны і бульбы. Аднак, на заводзе вельмі дрэнна абстаіць справа з хаваньнем гатовай прадукцыі. Ужо некалькі месяцаў на заводзе ляжыць каля 2-х тысяч кілё сушонай бульбы. Памяшканьне садавіннага склалу дзе хаваецца сушаная бульба, даволі вільготнае, што, бязумоўна, вельмі дрэнна адбіваецца на хаваньні бульбы і яблык. Бульба і яблык адсырэлі і могуць папсавацца. МЦРК і Белсадгародніна ня прымаюць належных мер каб паярэдзіць псаваньне.

Апроч таго трэба адзначыць, што тут вельмі дрэнна абстаіць справа з перавозкай гародніны са станцыі на завод. Гародніну возяць непакрытую, яна мокне пад дажджом і псуецца. Трэба зараз-жа пакласьці канец гэтай безгаспадарчасьці.

Розас.

„Рыхтавацца да загатовак гародніны мы ня думаем“

Аршанскі райспажыўсаюз да загатовак гародніны і садавіны не падрыхтаваўся. Калі ў старшыні райспажыўсаюзу **тав. Лобарава** запыталіся аб гэтым дык ён адказаў:

— Рыхтавацца да загатовак гародніны мы ня думаем, бо гэтым займацца будзе выключна райсадсаюз.

Райсаюз у тэй час лаялі за тое, што ён нічога ня робіць ў справе загатовак гародніны нават для сваіх сталовак. А зараз, калі ўжо разгарнуліся загатоўкі выявілася, што райсаюз сапраўды не гатоў да загатовак гародніны. Аршанскі райвыканком нават не ўключыў райсаюз ў лік загатоўцаў па гэтых загатоўках. Галоўным і асноўным загатоўцам па гародніне будзе зьяўляцца райкантора Белсадсаюзу.

Толькі 23-га жніўня Белкаапсаюз і яго аб'яднаньне Белсадгародніна, вельмі пакрыўджаныя тым, што райсаюзу не далі праў загатаўляць гародніны прыслалі райвыканкому вялікі ліст з патрабаваньнем, каб райсаюзу даць права праводзіць загатоўкі гародніны і ня менш як 50 проц. усяго таго, што вызначана па пляну ў раёне.

Цікава, дзе былі Белсадагароднiна і Белкаапсаюз раней? Чаму яны аб загатоўках гародніны праз райспажыўсаюз ня думалі да гэтага часу.

С—н.

ПАСТАНОВА

Народнага Камісарыяту працы БССР

12 верасьня 1931 г. № 41 гор. Менск.

„Пра увядзеньне простай зьдзельшчыны і пачасова-прэміяльнай аплаты працы работнікаў кіраўнічага апарату

Разгорнутае сацыялістычнае будаўніцтва народнае гаспадаркі патрабуе ад усяго кіраўнічага апарату, у інтарэсах шпаркіх тэмпаў сацыялістычнага будаўніцтва, яшчэ больш чоткай і бесьперабойнай работы.

За апошнія гады ў рабоце кіраўнічага апарату маюцца значныя дасягненьні, асабліва пасьля чысткі апарату ад чужых і варожых элемэнтаў, папаўненьне яго рабочымі вылучэнцамі з вытворчасьці, шэфства рабочых над апаратам.

Разам з гэтым у рабоце апарату ёсьць рад недахопаў, як-то: несвоечасовае складаньне вытворчых плянаў і прадстаўленьне ва ўстаноўленыя тэрміны балянсаў, справаздач, выпадкі несвоечасовага і недобраякаснага складаньня разьліку па выплаце зарплаты рабочым, перавышэньне выдаткаў супроць асыгнаваных каштарысаў, слабая продукцыйнасьць працы работнікаў апарату, цякучасьць яго асабовага складу.

Існуючая сыстэма арганізацыі і аплаты працы работнікаў кіраўнічага апарату (ўраўнілаўка, абязьлічка) фактычна не забясьпечвае пры новых умовах дастатковага стымулу для палепшаньня работы апарату.

У мэтах стымуляваньня інтэнсыўнасьці і прадукцыйнасьці працы работнікаў апарату, барацьбы з цякучасьцю, павышэньня кваліфікацыі для лепшага абслугаваньня сацыялістычнага будаўніцтва, разгортваньня сацспаборніцтва і ўдарніцтва, рашучага павароту яго тварам да вытворчасьці, **Народны Камісарыят Працы—БССР ПАСТАНАЎЛЯЕ:**

1. Устанавіць сыстэму аплаты служачых па прынцыпах матэрыяльнай зацікаўленасьці іх у барацьбе за высокія якасныя і колькасныя паказчыкі работ па наступных прадпрыемствах і ўстановах г. Менску:

Завод «Варашылава», зав. «Бальшавік», ф-ка «Кастрычнік», Наркампрацы, Наркамфін, Гарсавет, Лесбел, МЦРК, Белсельтрэст, Менская Кантора Дзяржбанку.

Пры правядзеньні гэтае сыстэмы павінны быць паложаны ў аснову аплаты ўстаноўленыя Наркампрацы БССР уніфікаваныя стаўкі зарплаты.

2. Сыстэмы заахвочваючай аплаты па розных мясцох работы могуць быць розныя, у залежнасьці ад характару работы складу апарату, абёму яго штату, маштабу работ і інш. момантаў, улічваючы, што нельга ні ў якім разе абмяжоўвацца толькі ўстанаўленьнем ставак месячнай зарплаты за ўсіх тых выпадках, калі выконваная ўсім апаратам альбо паасобнымі яго часткамі, ці нават паасобнымі працаўнікамі, работа можа быць нармавана, улічана і падлічвана.

Ва ўсіх гэтых выпадках павінна быць уведзена сыстэма простай зьдзельшчыны і пачасова-прэміяльнай аплаты працы за перавыкананьне звышустаноўленых для кожнай часткі апарату, ці паасобных работнікаў норм выпрацоўкі.

3. За норму выпрацоўкі для работнікаў апарату трэба прыняць тыя тэрміны работ, колькасьць працы, патрэбнай для выкананьня, той ці інш. час, які ўстанаўляецца адміністрацыяй прадпрыемства і ўстановы і зацьвярджаецца РКК.

4. За выкананьне норм ва ўстаноўлены тэрмін работнік, атрымлівае толькі стаўку зарплаты. Заахвочваньне ўстанаўляецца за датэрміновае выкананьне, за павялічэньне колькасьці работы супроць устаноўленай, за зьмяншэньне і эканомію ўстаноўленага часу і г. д.

Увага: За невыкананьне работнікам апарату ўстаноўленых норм выпрацоўкі, колькасных і якасных паказчыкаў, паказаных у п. III гэтае пастановы, устанаўляецца матэрыяльная адказнасьць па якой адміністрацыя мае права, па рашэньні РКК рабіць вылікі ў разьмерах ня звыш прадугледжаных арт. арт. 57 і 72 Кодэксу законаў аб працы.

5. Акрамя поўнага пераводу ўсіх работ, якія паддаюцца нармаваньню, вучоту і падліку на зьдзельную сыстэму аплаты, паказчыкамі, вакол якіх павінна будавацца сыстэма простай зьдзельшчыны і пачасова-прэміяльнай аплаты, зьяўляюцца прыкладна наступныя:

а) датэрмінова якаснае складаньне балянсаў:

б) датэрміновае выкананьне плянавых і апэрацыйных заданьняў па складаньні пляну кантрольных лічбаў, распрацоўкі паасобных работ, складаньне калькуляцый і г. д.

в) за добраякаснае складаньне разьліковых ведамасьцей на зарплату рабочых і поўнае зьнішчэньне пралікаў і памылак з імі.

г) за датэрміновае выкананьне ўсялякага роду сацыяльна-эканамічных заданьняў і правядзеньне масавых кампаній па розных пытаньнях, як-то: хлеба, лёну, торфу, леса, дрова і інш. загатовак, мобілізацыя ўнутраных сродак і рэсурсаў павялічэньня тавараз вароту і г. д.;

д) за эканомію сродак, сваячасовае папярэджваньне, сыгналізацыю і рэагаваньне з боку паасобных частак і работнікаў апарату на недахопы і прарывы, якія будуць зьнішчаны, дзякуючы сваячасоваму прадстаўленьню справаздачнасьці;

е) за добраякаснае складаньне і датэрміновае адсыланьне ў вышэйшыя інстанцыі рознага роду статыстычных форм, вестак, за поўнае зьнішчэньне выдаткаў, на тэлеграфныя міжгародныя тэлефонныя і паштовыя запытаньні, і напамінкі па дасылцы матар'ялаў, ці патрабуючых тлумачэньняў і дадаткаў па нядобраякасных ці не ў тэрмін дасланых матар'ялах, лічбах і інш. ведах і г. д.;

ж) за поўнае зьнішчэньне выдаткаў па звыштэрміновых работах, ушчыльненьне рабочага часу, шляхам правільнай арганізацыі працы, рацыянальнага скарыстаньня маючыхся ў апараце работнікаў, рэальнага выслабаненьня лішкаў і эканомію працоўных рэсурсаў інтэлектуальнае рабсілы за ўвядзеньне рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў, якія скарачаюць патрэбны час для выкананьня работ і колькасьць работнікаў, палепшаючы пры гэтым якасьць работы.

Па ўсіх пералічаных у гэтым пункце, ці могучых быць устаноўленых іншых паказальнікаў прэміяваньне ўстанаўляецца ня толькі за перавыкананьне ці за датэрміновае правядзеньне работ альбо заданьня, але кожная прароблена работа павінна разглядацца і расцэньвацца з пункту погляду якасьці і карысьці, якія атрымліваюцца ў выніку правядзеньня яе ў жыцьцё.

6. Для практычнага ажыцьцяўленьня мерапрыемстваў, пералічаных у гэтай пастанове, кіраўнікі ўстаноў, прадпрыемстваў і арганізацый сумесна з прафарганізацыямі павінны быць распрацаваны і складзены адпаведныя палажэньні, у якіх падрабязна паказаць аб'ёмы ў разьмеры работ кожнае часткі апарату, (бухгальтэрыі, статыстыкі, плянаваньня, забясьпячэньня, праектаваньня, разьліковага аддзелу, інфармацыі і г. д.), і паасобных работнікаў, працу якіх магчыма ўлічваць і нармаваць, тэрміны ці колькасьць неабходнага часу, для выкананьня і датэрміновага выкананьня (у процантах да асноўнае стаўкі зарплаты), таксама норма (ў процантах па скальнай шкале) вылікаў пры адхіленьнях ад устаноўленых норм і паказчыкаў.

У палажэньні павінны быць таксама паказаны парадак пастаноўкі вучоту і кантролю выкананьня, пэрсанальныя асобы, якім даручаецца вядзеньне вучоту па кожнай частцы апарату, ці асобным работнікам працуючым па сыстэме простай зьдзельшчыны і пачасовай прэміяльнай аплаты, парадак індывідуальнага разьмеркаваньня ствараўшайся сумы прэміяваньня (прапарцыянальна да атрымліваемай зарплаты ці інш. спосаб) парадак прэміяваньня кіраўнікоў тых ці іншых частак апарату (галоўбухаў, групаводаў і г. д.), мэтады і спосабы дачы ацэнкі па выніках работы, а таксама падлік эканоміі за прапрацаваны пэрыяд у выніку пераходу на паказальную сыстэму аплаты.

7. Правядзеньне сыстэмы простай зьдзельшчыны і пачасова-прэміяльнай платы павінна праводзіцца ў межах зацьверджаных для кожнага прадпрыемства, установы фонду зарплаты без дадатковых асыгнаваньняў. Пры гэтым для правядзеньня гэтае сыстэмы павінны быць створаны фонды за лік эканоміі па зарплаце і адлічэньняў на сацыяльнае страхаваньне, ад скарачэньня штату і рацыяналізатарскіх мерапрыёмстваў.

Напрыклад, у бухгальтэрыі працуе 10 асоб. месячны фонд зарплаты складае 1500 р., адлічэньні на соцстрах—150 р. Пры скарачэньні 2-х ці 3-х адзінак эканомія, якая ствараецца па зарплаце, і сум соцстраху, перадаецца ў фонд прэміяваньня ўсіх застаўшыхся ў бухгальтэрыі 7-8 чал. Другі прыклад—па штату для тэй ці інш. часткі апарату зацьверджана 10 чал. фактычна працуе 7-8 чал. Эканомія ад некамплектаваньня апарату фонд прэміяваньня.

У фонд прэміяваньня могуць быць таксама пераведзены часткі іншых сродкаў, атрымліваных у выніку эканоміі ад правільнай арганізацыі працы і пашыранага ўвядзеньня рацыяналізатарскіх мерапрыемстваў.

8. Размеры адлічэньняў ў фонд прэміяваньня па крыніцах, пералічаных у п. VII, павінны падзяляцца: 80 проц. сродак паступаюць у фонд прэміяваньня і 20 проц.—застаюцца ў распараджэньні прадпрыемства і ўстановы, за лік якіх ствараюцца інш. фонды сацыялізаваных відаў заработнае платы для гэтае групы работнікаў у выглядзе сацыяльна-культурных і бытавых мерапрыемстваў.

9. За лепшы распрацаваны праект палажэньня па ўжываньні і правядзеньні ў жыцьцё гэтае пастановы, які будзе прадстаўлены групамі або асобнымі работнікамі прадпрыемстваў і ўстаноў, як пералічаных, так і непералічаных у гэтай пастанове, пры Наркампрацы, НК-РСІ і ЦСПСБ ствараецца фонд прэміяваньня з наступных прэмій: 2 па 600 р. 3—па 400 р., і 5—па 250 р.

10. Акрамя прэмій, паказаных у п. IX, адміністрацыя прадпрыемства і ўстаноў абавязана ўстанавіць у сваіх апаратах прэміі для працаўнікоў за лепшы прапрацаваны і прыняты проект палажэньня па ўжываньні і правядзеньні ў жыцьцё гэтае пастановы.

Разымер прэміяваньня можа быць ніжэй поўмесячнага акладу зарплаты працаўніка, проект якога будзе адміністрацыяй прыняты.

11. Уся работа па пераходу на сыстэму зьдзельшчыны і пачасова-прэміяльнай аплаты, павінна быць скончана не пазьней 1-XI 1931 г.

12. Адзначаючы масавае ўжываньне работ у парадку сумяшчэньня, асабліва канторска-бухгальтарскага і статыстычнага пэрсаналу, што вядзе да зьніжэньня прадукцыйнасьці працы работнікаў апарату і масавым прымяненьні звышмерных работ, **Наркам працы БССР** катэгарычна забараняе ўсялякія сумяшчэньні пасад, ва ўсіх установах і прадпрыемствах.

У выключных выпадках сумяшчэньне асоба-кваліфікаваных работнікаў можа праводзіцца, згодна пастановы НКП БССР за 1-VI—1927 г. пры адсутнасьці перашкод па асноўнай рабоце работніка, наяўнасьці на тое згоды кіраўніка ўстаноў, дзе работнік працуе, дазволу органаў працы.

Народны Камісарыят Працы БССР

Баскін.

Заг. Сэктару Арг. і Аддар. Умоў Працы НКП БССР **Берзін.**

ТЭАТР-КІНО-ЦЫРК

МЕНДЗЯРЖ-ТЭАТР — СЁНЬНЯ АПОШНЯЯ ГАСТРОЛЬ праездам з замяжы засл. арт. рэспублікі **ЭРДЭНКО**. Продаж білетаў у рабочай касе з 12-2 і з 4-6 г. У касе тэатру з 12-2 і з 5-9 гадз. увеч.

ДЗЯРЖЦЫРК — **АПОШНІЯ ДНІ ПРАЦЫ** Зачыненьне 30 верасьня. **НОВАЯ БАЯВАЯ ПРАГРАМА**. Каса ад 12 гадз. дня. Білеты са скідкай у рабочай касе Пач. а 8 з пал. г.

Кіно-тэатр Культура — Яўрэйскі мастацкі фільм **ЧАЛАВЕК З МЯСТЭЧКА**

Кіно „Інтэрнацыянал“ — Мастацкі фільм **ХАЗНУШ**. Пачатак дзённага сэансу а 2, 3-30, веч. а 7, 8-40, 10-30

Кіно „Пралетары“ — Мастацкі фільм „РЭЙС МІСТЭРА ЛЛОЙДА“ звыш праграмы Бронецягн к. Пач. а 2 гадз.

„Чырвоная Зорка“ — Гукавы фільм **Адна**. Пачат. а 7, 8 45, 10-30 гадз. Каса адч. з 5 г.

БЕЛІЛЬНАПЕНЬКАТРЭСТ

(Ленінская, 31, рог Унівэрсытэцкай)

ЗАПРАШАЕ НА СТАЛЫЯ ПАСАДЫ

2 тэхналёгаў, 1 інж. будаўніка, 1 тэхніка будаўніка, 1 інжынэра мэханіка, 1 гал. бухгальтара, 2 бухгальтароў-інструктароў, 1 сартыроўшчыка валакна і трасты па лёну і канаплі

БЕЛІЛЬНАПЕНЬКАТРЭСТ

21 верасьня г. г. роўна а 4 гадз. 30 хв. увечары ў памяшканьні залі паседжаньняў Менгарсавету АДБУДЗЕЦЦА ПАСЕДЖАНЬНЕ ФРАКЦЫІ ГАРСАВЕТУ

Бюро Гаркому КП(б)Б

У панядзелак 21-га верасьня г. г. роўна а 5 гадзіне увечары ў памяшканьні залі паседжаньняў Гарсавету (Пляц Волі, № 4, 3-ці паверх) АДБУДЗЕЦЦА

ПАСЕДЖАНЬНЕ ПЛЕНУМУ МЕНГАРСАВЕТУ

Яўка членаў і кандыдатаў абавязкова

ПАРАДАК ДНЮ:

Аб падрыхтоўцы да навучальнага году

(дакл. т. Платун і Маслакоў)

Менгарсавет

ЗГУБЛЕНЫ:

Вайсковы білет Хрушчова А. С., выд. Горацкай прызыўной камісіяй, паявая кніжка, выд. Аршанскім ЦРК, квіт. 1107-п.

Вайсковы білет Журнасенава К. Л., выд. Дрыбінскім райваенкаматам, кв. 1107-п

Прафсаюзная кніжка Саніна Э. А., выд. Менскім Саюзам Харфавікоў, кв. 1107-п.

Асабовае пасьведчаньне Цвельбаума С. А., выд. Маскоўскай міліцыяй, кв. 1107-п.

Сяброўская кніжка Белякова В. В., выд. Сталінскім Саюзам Горнарабочых, квіт. 1107-п.

Вайсковы білет Уласава В. Ф., выд. Горацкім ваенкаматам, квіт. 1107-п.

Вайсковы білет Белкіна М. А., выд. Горацкім ваенкаматам, квіт. 1107-п.

Пасьведчаньне аб сканчэньні сельскай школы Дазорцава А. Я., выд. у в. Юльшына, квіт. 1107-п.

Мэтрычны выпіс Лісейчыкава Ю. П., выд. Гомельскім ЗАГС-ам, кв. 525.

Атэстат аб сканчэньні Пэдтэхнікуму ў г. Менску на імя Капцэлавай Г. Ф., квіт. 527.

Мэтрычны выпіс Рубінскай С. І., выд. Менскім ЗАГС-ам, квіт. 528.

Сяброўскі прафсаюзны білет за № 6941 Саюзу Харчавікоў на імя Заруба П., квіт. 529.

Вайсковая кніжка [illegible] І. В., выд. Аршанскім ваенкаматам, кв. 530.

Мэтрычны выпіс [illegible] М. Э., выд. Менскім ЗАГС-ам, квіт. 531.

Членская саюзная кніжка Ватацы Б. Ф., выд. Саюзам Саўгандальслужачых, квіт. 484.

Членскі білет № 60 сэкцыі навуковых працаўнікоў Ватаца Б. Ф., кв. 485

Адрас рэдакцыі і выдавецтва: Менск, Пляц Волі, 17, першы паверх. Тэлефоны: адказнага рэдактара 7-69, сакратара—4-78, сэктараў —6-15. Выдавецтва—2-44.
падпісная плата: 1 месяц—1 руб. 3 м-цы—3 р., 6 м-цаў—6 р., 1 год—12 руб.

Галоўлітбел № 598.

Друкарня імя тав. СТАЛІНА.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ